Пад рэдакцыяй
Пэтэра Лені

ISBN 978-80-969392-8-2
EAN 9788096939282

1 уводзіны
2 фабрыкі культуры
3 любіць будынкі
4 месцазнаходжанне
5 амбіцыі
6 старое супраць новага
7 вось як гэта заўсёды бывае
8 праграма вынікае з памяшкання
9 час для сквотынгу
10 без грантаў
11 прыватна-дзяржаўнае партнёрства
12 ахоўваецца дзяржавай
13 выгнаць прывідаў
14 схаваныя дэфекты
15 склад
16 гарышча
17 карабель
18 круглая пляцоўка
19 прасторы з патэнцыялам
20 газавы рэзервуар
21 чыгуначная станцыя
22 майстэрні ў вагонах
23 пляцоўка з піўных скрыняў
24 рост
25 пярэбары
26 памылкі
27 калі будзе гатова?
28 талака ідэй
29 ліючаяся форма
30 пляцоўкі
31 спытай самога сябе
32 парада па абнаўленні
33 рамонт: дапамагчы справай
34 перадача архітэктурнага бачання
35 спярша абалонка
36 памяншэнне пляцоўкі
37 часовыя перагародкі
38 адасабленне публікі ад персаналу
39 вузкая пляцоўка
40 галерэя ў прамзоне
41 кратка
42 рухомая мэбля
43 тэатр чорнай скрыні за хвіліну
44 роўная падлога
45 тэлескапічныя крэслы
46 аця́пленне
47 гістарычныя слаі
48 фальшывыя рэлiквii
49 абнаўленне, затым тэндар
50 камітэт па абнаўленні
51 галоўны падрадчык
52 поўны сэрвіс
53 безбар'ернасць
54 адзіны адрамантаваны будынак
55 брама
56 вестыбюль
57 шатня
58 сцежкі
59 інфаграфіка
60 сувязь з рэзідэнтамі, якія пераязджаюць
61 сонечныя батарэі

teh book oktober obalka xx.indd 1
28.11.2014 16:59

# Дапаможнік па канструяванні прасторы для цэнтраў культуры


62 пажарны выхад
63 вентыляцыя
64 вертыкальны сад
65 аб’яднанне
66 прамысловая і культурніцкая вытворчасць
67 жывы музей
68 ліхія часы
69 часткова адчынена
70 боксы ў адкрытай прасторы
71 музей, пляцоўка для імпрэз, рэстарацыя
72 прылады
73 лябёдка
74 майстэрні
75 пякарня
76 іранская бібліятэка супрацiву
77 кнігарня
78 веламайстэрня
79 кухня
80 шум
81 святло
82 бары
83 арэнда голых памяшканняў
84 праца за ежу
85 гільдыя цесляроў
86 рамонт за кошт юбілею
87 дываны з выставачнага цэнтра
88 дажджавікі задарма
89 пазычанне
90 шматразовыя кубкі
91 прыбіральні
92 накіраванае святло
93 лагатып
94 візітоўкі
95 культура плаката
96 адкрытасць
97 вэрхал
98 доступ
99 прыгажосць
100 увахоД
101 велапаркоўка
102 два фасады
103 галерэя на фасадзе
104 часовы фасад
105 графіці
106 сувязь з супольнасцю графіцістаў
107 дзірка
108 пергола
109 падворак
110 сад на тэрасе
111 тэраса з патэнцыялам
112 тэраса як рэклама
113 гарод на даху
114 зялёны дах
115 алейная культура
116 асфальтаваная дзялка
117 адкрытая тэрыторыя
118 бачнасць і бяспека
119 развіццё тэрыторыі
120 агароджы
121 вольнае поле
122 мастацтва супраць крэатыву
123 канец
124 цітры
125 удзельнікі

# Культура і Крэатыўнасць

Праграма ЕС і Ўсходняга партнёрства

Праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзом.

Праграма рэалізуецца кансорцыумам на чале з Брытанскім саветам, пры ўдзеле Фонду Сораса ў Малдове, Нацыянальнага цэнтра культуры Польшчы і Інстытута імя Гётэ.

Stanica Žilina-záriečie

TRANS
EUROPE
HALLES

месца (рэ)канструкцыя ўнутры звонку часовае малое вяліка е

# 1 уводзіны

Канструяванне прасторы, у якой мы жывем, – бясконцы працэс. У яго аснове – імкненне зрабіцца лепшымі, поўнымі жыцця, імкненне паспяваць за развіццём грамадства і сацыяльных патрэб.

Для сяброў сеткі Trans Europe Halles канструяванне прасторы наўпрост звязанае з культурніцкай дзейнасцю, якой яны паралельна займаюцца. І гаворка не толькі пра вынікі. Галоўнае тут – сам працэс фармавання прасторы з яе далейшым выкарыстаннем. Архітэктурны дызайн (нароўні з гарадскім планаваннем) і мастацкія або культурніцкія праекты – з'явы ўзаемастваральныя. Вось чым крэатыўныя прасторы прынцыпова розняцца ад вялікіх дзяржаўных устаноў.

Рэч тут не ў фасадах, колькасці скульптур і памеры інвестыцый. Уся соль – у цесных дачыненнях паміж рознымі праектамі, імпрэзамі, супрацоўнікамі, дзеячамі культуры ды іх публікай. Рашэнні праблем, якія выкшталтоўваюцца ў свеце цэнтраў культуры, зазвычай гучаць неверагодна для іншых сектараў. Яны – вынік творчага сутыкнення архітэктараў, дызайнераў, творцаў, менеджараў, валанцёраў, студэнтаў, тэхнічнага персаналу, публікі і суседзяў.

Гэтая кніга – суплёт асабістага досведу, назіранняў, меркаванняў і гледзішчаў розных людзей на тэму цэнтраў культуры. Яна змяшчае прыклады, гісторыі, схемы, планы і дыяграмы. Гэтую кнігу можна чытаць як энцыклапедыю, падарожную кніжку, інструкцыю або дзённік.

Яна прысвечаная цэнтрам, якія існуюць або толькі ствараюцца, архітэктарам і неархітэктарам. Даследаванне засяроджанае на выяўленні і апісанні архітэктурных задач і спосабаў іх рашэння – ад малых і бюджэтных распрацовак, зробленых цягам тыднёвага майстар-класа, да доўгатрывалых працэсаў, а таксама ўвага была нададзеная ацэнцы патрэб цэнтраў культуры, іх кантэксту, праблемам і пошуку іх вырашэння.
Я пачаў гэтую кнігу напрыканцы 2011 года. Першы цэнтр, які я наведаў, быў Цэнтр мастацтваў Bakelit у Будапешце ў траўні, апошні – Village Underground у Лондане ў снежні 2013 года.
Усё пабачанае і пачутае я паспрабаваў увасобіць як мага больш натуралістычна. Маёй мэтай было абстрагавацца ад ролі архітэктара або крытыка, які раіць, як трэба. Я хутчэй спрабаваў ненавязліва захаваць тыя моманты, якія палічыў незвычайнымі і вартымі ўвагі, збольшага па слядах аповедаў маіх рэспандэнтаў. Інфармацыя выкладзеная сцісла, можа нават трохі нязграбна, без усякіх празмернасцяў. Часам галоўнае – словы, часам – здымак. Я паспрабаваў перакласці свет, як я яго ўбачыў – без стылізацыі і з мінімумам заўваг, – каб не звузіць кола будучых інтэрпрэтацый і практычнага ўжытку.

Гэтак паўсталі 123 гісторыі з 30 цэнтраў. Разам яны фармуюць мазаічную базу звестак, якую я – ужо як архітэктар – хачу ўзяць за пункт адліку для працы з незалежнай культурніцкай прасторай.

Я дзякую ўсім, хто зрабіў унёсак у стварэнне гэтай кнігі: маім супрацоўнікам, кансультантам, рэспандэнтам, усёй сетцы Trans Europe Halles і асабліва цэнтру культуры Stanica Žilina-Záriečie.

*Пэтэр Лені*



Пэтэр Лені атрымаў навуковую ступень у галіне архітэктуры ў Славацкім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Ён кіруе архітэктурнай студыяй «20-21» у Браціславе.

# 2 фабрыкі культуры

Ад самага заснавання сеткі Trans Europe Halles (ТЕН – анг. «Транс’еўрапейскія залы») існавала адна трывалая прывязка – старыя фабрычныя памяшканні. Нават сёння ў крытэры сяброўства ў ТЕН прапісана, што «пажадана, каб цэнтр быў створаны на базе камерцыйнай ці прамысловай спадчыны». Маладыя актывісты і мастакі могуць самавольна засяліць або арандаваць такога кшталту будынкі, бо яны закінутыя або іх танна здаюць – гэта зразумела; цяжэй зразумець, што, акрамя змушанасці, вабіць іх да гэтых памяшканняў. Няма нічога дзіўнага ў тым, каб заняць заняпадныя, халодныя і нязручныя склады, калі ў вас няма іншага выбару, але ж выгодныя, новыя будынкі з усімі камунікацыямі – прывабнейшыя, там больш перспектываў. Дык у чым прынцып?

Магчыма, адказ на гэтае пытанне палягае ў гісторыі саміх памяшканняў. Нашае індустрыйнае мінулае – гэта адначасова гісторыя нашага грамадства і ў дадатак гісторыя грамадскіх рухаў. Нашыя продкі ў першым-другім калене – дзеці прамысловай рэвалюцыі, іх калыска – фабрыкі і дэпо, склады і заводы па вытворчасці тавараў масавага спажывання. Менавіта ў гэтых будынках і іх аколіцах яны пражылі жыццё, менавіта тут – падмурак іх грамадства, апірышча іх барацьбы, іх зазямленне. Адсюль пайшлі нашыя сучасныя гарады, выштукаваныя работай, умельствам, вынаходлівасцю і стваральнасцю людзей працы. Тут сфармаваліся і вызнаваліся прынцыпы працоўных рухаў, а таксама ідэі роўнасці, салідарнасці і міжнароднай супрацы.

Гэткім жа чынам грамадскае і культурнае жыццё працоўных ды іх сем’яў круцілася вакол гэтых агменяў індустрыі; маючы за аснову падставовыя патрэбы чалавека ў індывідуальным і калектыўным выражэнні і камунікаванні, яны сфармавалі свае ўласныя асяродкі, уласныя культурна-пабытовыя аб’екты. Амаль два стагоддзі гэтыя асяродкі раслі вакол прамысловых будынкаў, і гэтая ўзаемасувязь пратачылася ў ДНК сучасных гарадоў і іх жыхароў.

Калі ў 1960-я і 1970-я гады вялікі век індустрыялізацыі ў Еўропе скончыўся, будынкі гэтай эпохі апусцелі. Але выдае на тое, што яны працягваюць вабіць новыя пакаленні, якія назапасілі розныя ідэі па іх выкарыстанні. Невыпадкова тое, што можа лічыцца сімвалічным пераходам ад старога ладу да новага, мела назву The Factory – «Фабрыка». Вядома, гаворка пра майстэрню Эндзі Ўоргала, заснаваную ў 1962 годзе на 47-й вуліцы Усходняга Манхэтэна, у доме 231. Калі вы паглядзіце на здымак тагачаснага Нью-Ёрка, то заўважыце, як архітэктура дапаўняе большасць сумежных відаў мастацтва або цэнтраў культуры, якія захапілі старыя прамысловыя памяшканні: цагляныя муры, металалом, вонкавыя трубы, блокі з механізмамі і мноства падпор. Ўоргал паходзіў з сям’і рабочых, а гэта дае думку, што, шануючы нашых продкаў, мы прагнем адшукаць у сумленнай працы чысціню і нават годнасць.

Пачынаючы з 1960-х гадоў па ўсёй Еўропе пашырылася ідэя: культура павінна служыць не толькі ўладнаму класу, кожны мае роўныя правы на культурніцкае выказванне. Яна лягла на ўрадлівую глебу новых моладзевых рухаў. Гэта азначала знайсці прыдатнае месца, каб абвесціць свой ідэйны маніфест, паколькі істэблішмент не збіраўся дазволіць «рэвалюцыянерам» патрапіць у палацы культуры. Закінутыя прамысловыя памяшканні зноў прыдаліся як фабрыкі іншага кшталту – фабрыкі культуры. Новыя формы музыкі, танца, тэатра, выяўленчага мастацтва – адным словам, усемагчымае наватарства, якое ішло поруч з пераменамі і свабодай, запоўніла былыя прамысловыя цэхі. Ад контркультуры да панку, ад камун да эка-супольнасцяў, ад лакальных цэнтраў культуры да анархісцкіх сквотаў – уваскрашэнне нашай індустрыяльнай спадчыны працягваецца. Падзенне жалезнай заслоны ў 1989 годзе агаліла новыя ландшафты, спярэшчаныя такімі старымі будынкамі, і акурат цяпер у іх адбываюцца гэткія ж пераўвасабленні, як раней – з іх пабрацімамі на Захадзе.

Сетка TEH вылучае і падтрымлівае гэты трэнд ад яго з’яўлення. Яе першыя чальцы і самі былі атабарыліся ў закалочаных рынках, старых фабрыках і г.д. У тым ліку першапраходцы новага культурніцкага руху баранілі былыя прамысловыя памяшканні і заклікалі да іх захавання. Гэтая спадчына нагадвае нам пра людзей, якія пабудавалі нашае грамадства. Ім не ставяць помнікаў, але гэтыя структуры, дзе яны кавалі наш дабрабыт і магчымасці развіцця для новых пакаленняў, перадаюць іх дух. У гэтых будынкаў ёсць свой шарм – часам гэта простыя і зграбныя формы, як у былога малаказавода, які цяпер заняты цэнтрам Mejeriet у шведскім горадзе Лунд, або падобны да катэдры гмах цэнтра культуры Kaapelitehdas – былы завод кабельнай прадукцыі ў Хельсінкі, дзе колісь рабілі трансатлантычныя камунікацыйныя кабелі для Nokia. Усе яны прадстаўляюць іншы від гісторыі – нераспаведзеную гісторыю народа, вылатаваную новымі пакаленнямі, якія працягваюць змаганне за культуру без іерархій.

Паўсюль у Еўропе можна знайсці такія цэнтры мастацтва і культуры, а таксама такія будынкі. Хадземце ж на агледзіны.

*Сэндзі Фіцджэралд*

*Fabryka sztuki, Лодзь*

# З любіць будынкі

*Стасункі людзей з месцам, дзе яны працуюць, заўсёды адчуваюцца і звонку таксама.*

«Мы выкарыстоўвалі гэтыя будынкі і да абнаўлення. Яны падабаліся нам такімі, як былі, – трохі заняпаднымі, але вельмі адметнымі, з лёгкім постындустрыяльным флёрам. Тут ладзіліся фестывалі і танцавальныя прадстаўленні, кінапаказы, майстар-класы, канферэнцыі і шмат чаго яшчэ. Але будынкі трэба абнаўляць, бо ў пэўны момант яны могуць разваліцца.

Пакуль не прыехала цяжкая тэхніка, мы зладзілі “развітальную вечарынку”, запрасіўшы ўсіх нашых сяброў, партнёраў, публіку. Было вельмі кранальна. Мы пахаджвалі вакол будынка, мацалі цэглу, усцешаныя, што прыйдзе “новае”, адначасова спадзеючыся, што старое застанецца навідавоку. І, як вы бачыце, у нас атрымалася! Рамонт і аднаўленне былі зробленыя з вялікай увагай да дэталяў».

*Агата Этмановіч*




FABRYKA SZTUKI
ART_IN

# 4 месцазнаходжанне

*У горадзе ці за горадам месціцца цэнтр культуры?*
*У цэнтры горада ці ў прыгарадах?*
*У асобным будынку ці гэта частка комплексу?*



*Village Undeground, Лондан, 15 000 000 жыхароў (густазаселеная гарадская тэрыторыя)*



*Antic Teatre, Барселона, 5 300 000 жыхароў (густазаселеная гарадская тэрыторыя)*



*Röda Sten konsthall, Гётэборг, 522 000 жыхароў*



*Moritzbastei, Ляйпцыг, 521 000 жыхароў*



*Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна, 82 000 жыхароў*



*OZU, Монтэлеонэ-Сабіна, 1 257 жыхароў*



*Not Quite, Фэнгерсфош, 345 жыхароў*

NELK, Тарту

# 5 амбіцыі

*Амаль немагчыма ўявіць, што гэта можа спрацаваць, – менавіта таму гэта пасуе ўскрай амбітным.*

Леміт Каплінскі паказвае нам вялізны занядбаны ўчастак. Мы мінаем шмат будынкаў, і апошні з іх, мусіць, уяўляе сабой самы вялікі выклік.
Той будынак найдалейшы ад уваходу на ўчастак, ён найвялікшы, самы пашкоджаны і патрабуе найбольшых інвестыцый. Уражвае ягоная здольнасць заграбаць увесь час і ўсе грошы, якія гаспадар гатовы ўкладаць, спадзеючыся зрабіць з яго цукерку.




MADNeS!

# 6 старое супраць новага









*Verkatehdas, Хямээнлінна*



*A38, Будапешт*



*Melkweg, Амстэрдам*



*Menų spaustuvė, Вільня*



*Röda Sten konsthall, Гётэборг*

<u>*NOASS, Рыга*</u>

# 7 вось як гэта заўсёды бывае

«Людзі збіраюцца разам, бо яны сябруюць. У іх агульныя мэты, агульныя зацікаўленні, таму яны пачынаюць рабіць усё большыя праекты, і ўрэшце ім патрэбная арганізацыя.

Наша арганізацыя не была выключэннем. Яе стварылі сябры, якія аддаюць перавагу творчай працы. Я быў чынным мастаком, мае сябры – паэтамі, пісьменнікамі, кіношнікамі і крытыкамі мастацтва. Агульным грунтам, вядома ж, было піццё віна, супольныя вечарынкі, кніжныя прэзентацыі, адкрыццё выстаў. Потым, пасля пагулянак, – дыскусіі пра найважнейшае ў мастацтве, пра тое, што трэба падтрымаць, і пра тое, што яшчэ нам трэба, каб зрабіць прастору для творчых людзей.

Пакрысе мы запачаткавалі нашу арганізацыю ў маёй майстэрні. Потым гэта ператварылася ў прастору для выстаў. Пазней яна ператварылася ў публічную прастору для разнастайных творчых імпрэз, не толькі для выяўленчага мастацтва. Мы ўбачылі, што да нас сталі хадзіць наведнікі і сябры, якіх больш за сто чалавек, і што маленькага пакоя больш не дастаткова. Цяпер гэта наш офіс. Потым мы ўбачылі, што дзеля ўсіх гэтых праектаў ускрай неабходна стварыць большую прастору».

*Дзынтарс Зілгалвіс*




Es Būšu

# 8 праграма вынікае з памяшкання

## *З аднаго боку – абмежаванні, з іншага – унікальныя характарыстыкі.*

«Гэта вельмі вялікі будынак – 1 400 кв. м, але прастора падзеленая на шмат пакойчыкаў. Мы б хацелі збіраць больш людзей у адным пакоі. Разам мы можам прымаць 1 200 наведнікаў, але не ў адным пакоі.
Гэта досыць унікальна – мы можам ладзіць розныя імпрэзы. У адным пакоі мы можам зладзіць тэатр, у другім – музыку, у трэцім – чытанні. З аднаго боку, гэта перавага, з іншага – праблема, бо мы абмежаваныя, мы можам ладзіць канцэрты максімум для 300 чалавек.
Мы робім імпрэзы, якія ахопліваюць увесь будынак. Вы можаце хадзіць па коле і за адзін вечар патанчыць пад радыйную музыку або пад хард-рок ці тэхна. Такі сабе маленькі фестываль. Калі вы ў пакоі з электроннай музыкай, дык з паверха, дзе гучыць цяжкі рок, нічога не чуваць. Яны цалкам адасобленыя, але вы хутка і лёгка можаце патрапіць на наступны паверх і зазірнуць туды. Муры тут тры метры таўшчынёй.

Мы не можам памяняць асноўную канструкцыю, каб усё тут пашырыць. Наша задача цяжкая, але цікавая – выкарыстаць прастору разумным чынам і выбудаваць культурную праграму так, каб яна пасавала будынку.

Вы не можаце перабудаваць памяшканне пад імпрэзу, але вы можаце памяняць праграму пад будынак».

*Торстэн Райтлер*

*Pekarna magdalenske mreže, Марыбор*

# 9 час для сквотынгу

*Штуршком стала адчуванне, што чыёсьці права на прастору парушаецца.*



«Напачатку была сетка, сфармаваная разнастайнымі арганізацыямі, збольшага культурніцкімі, – і творцамі: музыкамі, мастакамі, якія рупіліся, каб у горадзе былі месцы для (вы)творчасці. Яны мелі намер зрабіць з “Пякарні” цэнтр культуры. Гэта было ў 1992-м.

Архітэктурная студыя зрабіла накід плана, з якім ужо можна было пачынаць працэс рэканструкцыі і аднаўлення. Але ўсё загрузла, бо палітычны курс хістаўся, і галоўны акцэнт зрабілі на пабудове мастоў – важнейшых для тадышняй палітычнай сітуацыі аб’ектаў.

У 1994-м мы заўважылі, што нехта знаходзіцца на тэрыторыі комплексу – на вельмі дарагіх машынах, – робячы абмеры тэрыторыі. Нехта іх убачыў і папярэдзіў нас. Гэта сталася галоўнай прычынай, чаму нам захацелася засяліцца без дазволу, зрабіць тут сквот. Мы хацелі абараніць гэты будынак, запэўніцца, што ён будзе адпавядаць мэтам, дзеля якіх быў пабудаваны».

*Борут Вэнцэль*


KURD

*Цэнтр творчых індустрый «Фабрика», Масква*

# 10 без грантаў

«Фабрыка» аплачвае і вырабляе культурніцкае напаўненне сама. Мы не маем ніякіх фундацый ці спонсараў. Нашая «Фабрыка» – парасонавы цэнтр, у нас ёсць рэзідэнты. Мы даём ім памяшканні – яны плацяць арэнду. Арэнда нізкая, нешта кшталту зніжкі для творчых індустрый. Гэтых грошай больш-менш стае, каб плаціць заробкі і падаткі, рамантаваць нашыя будынкі, а таксама ладзіць выставы. Так што мы – цалкам самастойныя і не паслугуемся ніякай фінансавай дапамогай.

Для мяне прасцей самастойна прымаць рашэнні па грашах і рабіць нешта, каб зарабіць гэтыя грошы самой, чым запаўняць тысячы заявак, просячы кагосьці даць мне грошы. Паміж тым, каб выдаткаваць дзесяць гадзін, робячы нешта самастойна, каб зарабіць грошы, і дзесяццю гадзінамі, якія сыходзяць на запаўненне грантавых заявак, я абяру першы варыянт. Гэта святы прынцып еўрапейскіх панкаў – Do it yourself, DIY (анг. «Зрабі гэта сам»). Ведаю: каб атрымаць грант, я мушу запоўніць тысячы фармуляраў, а потым напісаць тысячу справаздач пра тое, як я выдаткавала грошы, а для мяне гэта будзе праблемай».

*Ася Філіпава*

# 11 прыватна-дзяржаўнае партнёрства

*Формы самакіравання, пазычаныя са сфер, не звязаных з культурай, даюць новыя магчымасці для фінансавання праектаў.*

«Мы працуем на прынцыпе прыватна-дзяржаўнага партнёрства. "Фабрыка мастацтваў" была створаная на аснове пагаднення паміж дзвюма грамадскімі арганізацыямі (тэатрам "Харэя" і Арт-цэнтрам Лодзі) ды ўладамі горада Лодзь. Мы зарэгістраваныя як муніцыпальная арганізацыя.

Фінансаванне для заснавання "Арт_Інкубатара" прыйшло ад структурных фондаў Еўразвязу. Напэўна, будзе цікава зазначыць, што грант прыйшоў не з сектара, які адказвае за культуру, культурную спадчыну або турызм, а якраз з сектара, што мае на мэце ўзмацняць прадпрымальніцкі патэнцыял. Адсотак асабістага ўнёску арганізацыі кампенсавалі ўлады горада Лодзь. Каб стаць бізнесам, "Фабрыка мастацтваў" мусіла пераасэнсаваць сябе, рэарганізавацца і развіць новыя функцыі. Гэта досыць унікальна. І гэта не было лёгка. Працэс патрабаваў пераканаць улады быць крыху больш даверлівымі (і нашмат больш шчодрымі!) да новай схемы працы. На практыцы гэта азначала змену стаўлення да творчага сектара: ад "грантасмокаў" да вытворцаў эканамічных і сацыяльных даброт. Гэта было цяжка, але, як вы бачыце, здзяйсняльна».

*Агата Этмановіч*

*Moritzbastei, Ляйпцыг*

# 12 ахоўваецца дзяржавай

*Разам з некаторымі перавагамі статус помніка архітэктуры прыносіць шмат абавязкаў.*

Бастыён Морыца – сярэднявечная крэпасць, адзінае, што захавалася ад старога гарадскога мура, пабудаванага ў 1551 – 1553 гадах, у Ляйпцыгу. З 1982 года ў крэпасці – цэнтр культуры.

150 гадоў будынак выкарыстоўваўся як падмурак для школы, якая стаяла на ім.

«Бастыён Морыца напоўніўся зямлёй, яго памяшканні не выкарыстоўвалі, ніхто не ведаў, што з ім рабіць. Яго перабудавалі ў 1970-я і пачалі аднаўляць – у прамым сэнсе слова, выкопваць з-пад зямлі.

Мы сутыкнуліся з забаронамі: у нас была канцэртная зала з вельмі кепскай акустыкай, пячорны гук з глыбіняў XVI стагоддзя. Тут былі памяшканні для жаўнераў. Досыць цяжка атрымаць добры гук. Мы хацелі палепшыць гэта – але калі мы возьмем тканіну ці нешта яшчэ дзеля паляпшэння акустыкі, дык схаваем першапачатковую архітэктуру, а гэта немагчыма. Для нас гэта цяжкая, але цікавая задача; каб палепшыць гучанне, мы эксперыментуем з часовымі пакрыццямі – тэкстылем ці драўнінай».

*Торстэн Райтлер*

# 13 выгнаць прывідаў

*Калі прастора з цягам гісторыі зрабілася сімвалам чагосьці негатыўнага, неабходна заняць цвёрдую пазіцыю, агучыць яе і пачаць усё спачатку.*

«UFA была самай значнай кінакампаніяй у Нямеччыне да, падчас і пасля Другой сусветнай вайны. На гэтай фабрыцы выраблялася нацысцкая прапаганда. Высветліўшы гэта, мы задумаліся, што рабіць з гэткай спадчынай.

У Заходнім Берліне ды шмат у якіх іншых мясцінах існавала тэндэнцыя зруйнаваць усе гмахі, якія нагадваюць людзям непажаданыя старонкі гісторыі.

Самавольна засяліўшыся ў гэтыя будынкі, мы захавалі іх. Мы крыху падыскутавалі і прынялі рашэнне ісці далей. Мы зладзілі цырымонію па выгнанні старых духаў з кінастудыі і запрасілі сюды новых. Мы – новае жыццё будынкаў кінастудыі UFA. Мы напоўнілі іх новымі ідэямі і творчымі задумамі.

Стуль у нас усё ўлагодзілася – мы ўзяліся за іншыя формы мастацтва».

*Зігрыд Німэр*





SCHWARZBLOND
BENSUSAN

# 14 схаваныя дэфекты

*Нават эксплуатацыя амаль новага будынка можа выявіць схаваныя хібы, пакінутыя папярэднімі жыхарамі.*

«Гэтае месца пабудавалі ў 1980-я. Меркавалася, што тут будзе друкарня. Яна адчынілася на паўгода і потым яе зачынілі, бо яна стаяла надта адасоблена. Вуліцы – завузкія, фурам з паперай цяжка было сюды заязджаць.
Потым чатыры гады тут працавала цукеркавая фабрыка. Тут хацелі рабіць цукеркі, але ўрэшце іх толькі расфасоўвалі. Часам тут расфасоўвалі цукеркі, чый тэрмін прыдатнасці скончыўся. Гэтае месца належыць мясцовай абшчыне. Ім удалося выгнаць фабрыку, але памяшканні засталіся набіткаваныя ўсёй гэтай прадукцыяй. Тоны сапсаваных цукерак паўсюль… Тон васямнаццаць. У нас заняло два гады ўсё тут наладзіць і вызваліць памяшканне. Каб знайсці падмуркі, нам трэба было капаць наўкола. Мы высветлілі, што падмурак зроблены зусім не так, як гэта заяўлена ў архітэктурным праекце. Падчас рэканструкцыі мы выявілі, што тут шмат чаго зроблена абы-як. Напрыклад, вокны не зачыняліся.
На фабрыцы мусіла быць кухня. Былі падведзеныя трубы. Мы падумалі – ну, выдатна, паставім тут рукамыйнік. Пачалі яго рабіць і раптам выявілі, што труба для сцёку вады – фальшывая! Вада нікуды не выліваецца. Быў толькі пачатак трубы, а потым усё ўпіралася ў сценку.

Нашто людзям было будаваць фабрыку тут, супраць ліха на ўзгорачку? Без падмуркаў? Адказ такі: былі нейкія дзяржаўныя грошы, каб будаваць прамзоны ў гарах, можа быць, каб фінансаваць нейкі розрух у рэгіёне. Было прынятае рашэнне будаваць, потым з будоўлі скралі грошы – і вось маем вынік».

*Паоля Сімоні*



*Village Underground, Лондан*

# 15 склад

*Склад = шмат месца.*

Высокія столі, у памяшканне можна лёгка патрапіць з дзвюх вуліц, ёсць прылеглыя памяшканні, прыдатныя для вестыбюля, прыбіральняў, бара і гаспадарчых пакояў.

Мулкія паверхні, ад якіх гук адбіваецца надта жорстка, а таксама дах з кепскімі тэхнічнымі паказнікамі можна хутка перарабіць.

Дасканалае месца для публічнай пляцоўкі.








THINK OF IT
LOOK AT
SIDE OF LIFE

IMAGINARIUM
55





# 16 гарышча

*Кожная загана памяшкання, праз якую яго, у параўнанні з іншымі прасторамі, складаней эксплуатаваць, змяншае да яго інтарэс, і як вынік – рынкавы кошт ніжэйшы. А наш інтарэс да такога памяшкання толькі прачынаецца.*

Цэнтр мастацтваў «Бакеліт» месціцца пасярод вялікага абнесенага плотам комплексу з дзейнай прахадной, сумежнымі майстэрнямі, крамамі будаўнічых матэрыялаў.
У 1991 годзе Мартан Баўэр, уладальнік «Бакеліта», купіў 1 600 кв. м фабрычнага гарышча – лофта. Сёння гэта 2 200 м. Дзе было магчыма (узяўшы ў разлік канструкцыю і ўжыўшы праектныя хітрыкі), прадстаўнікі «Бакеліта» падзялілі памяшканне з высокімі столямі на некалькі паверхаў. Яны пабудавалі новы паверх вышынёй у тры метры, павялічыўшы тым самым працоўную прастору. Нават сёння ёсць яшчэ куды пашырацца. Столь па-над кухняй, дзе гатуецца ежа для фуршэтаў, надта высокая. Яе хутка зруйнуюць і пабудуюць нанова, крыху ніжэй. А прасторы зверху вызваліцца дастаткова, каб размясціць там офіс.
Падчас пакупкі лофт быў таннейшы за цокальны паверх, бо ў яго было цяжка патрапіць. Праблема доступу для людзей, а таксама дастаўкі абсталявання, піўных бочак, канап і інвалідных вазкоў была вырашаная пры дапамозе грузавога ліфта, які месціцца ля галоўнага ўвахода.



# 17 карабель

*Арэнда памяшканняў на ўзбярэжнай дарагая і самая прывабная. Задума стварыць цэнтр культуры на караблі выглядае эфектыўнай.*

Перавага перад іншымі відавочная: яны на зямлі, вы – на караблі. Карабель – моцны сімвал. Нават калі ён на прыколе, па-над ім лунае дух адкрывальніцтва і прыгодаў. Калі ідуць хвалі, дык палуба крыху гайдаецца, прыўносячы атмасферу дзёрзкасці і навіны.
«А38» – вось як называецца карабель сёння. «А» значыць «Арцёмаўск», назва тыпу баржы, а «38» – серыйны нумар. Украінскую баржу колісь выкарыстоўвалі для перавозкі камення. На месцы галоўнага грузавога адсека цяпер канцэртная зала, дзе граюць рок. Архітэктары перараблялі баржу тры гады. Рэканструявалі яе ў рачных доках славацкага горада Комарна; у Будапешце зрабілі інтэр'ер і ўсталявалі тэхніку – управіліся ўсяго за тры месяцы. Адкрыццё зладзілі 30 красавіка 2003 года. Першапачатковыя інвестыцыі ў 3 000 000 еўра вярнулі праз 6-7 гадоў. Гэта дазволіла ўладальніку пабудаваць другі карабель – гэтым разам абсалютна новы, які цяпер стаіць на якары па-за першым. Месца стаянкі парахода была выбрана вельмі прагматычна.
Гаворка зусім не пра краявід, славутасці або багемны раён горада. Набліжанасць да цэнтра горада, які знаходзіцца пад абаронай ЮНЕСКА, і суседства з мостам Петэфі – вось прыярытэт. Параход стаіць на якары за якія 135 м ад моста. Дзякуючы ўдаламу праекту, дастатковаму фінансаванню, а таксама імпэту ўдалося пабудаваць пяць цалкам аснашчаных бараў, дзве тэрасы і канцэртную залу (сістэма «дом у доме»), а на борце можа памясціцца разам 700 чалавек. Параход мае выдатныя акустычныя характарыстыкі. Тут ёсць рэстаран, галерэя, студыя гуказапісу і офісы.




ARTEMOVSZK 38

*DOM La Cupola Del Pilastro, Балоння*

# 18 круглая пляцоўка

*Круглае ў плане памяшканне з раўнамерна размеркаванымі па ім тэхнічнымі канструкцыямі дазваляе выбудоўваць прастору для сваіх патрэб.*

«Насамрэч вы можаце ставіць тут любую п’есу. Сцэны падымаюцца і апускаюцца, можна выкарыстаць чорную заслону. Вы можаце зашморгнуць яе, калі вы хочаце зрабіць прадстаўленне тэатра чорнай скрыні».

*Фэдэрыка Рокі*

Тэхнічнае абсталяванне, якое знаходзіцца на адным узроўні над аб’ёмам залы, дазваляе бясконца гуляцца з прасторай. Ліхтары можна павесіць дзе толькі магчыма, памяшканне падзяліць. Сцэну ўзнесці ў цэнтры, а публіку пасадзіць па коле або ў коле. Сцэна можа быць на подыуме з публікай перад ім або наадварот.





*Village Underground, Лондан*

# 19 прасторы з патэнцыялам

*Кожны дзень мы мінаем нябачныя воку прасторы, якія ідэальна пасуюць, каб стварыць там цэнтр культуры. Калі нехта паказвае, як іх абсталяваць, нябачнае раптам робіцца відавочным.*

Цэнтр вялікага горада набіткаваны ўсім-усялякім і дарагі. Найбольш прапановы, найбольш попыту, найдаражэйшая зямля і найвышэйшая арэнда. «Вілідж Андэграўнд» цяпер стрыжэ купон, бо мае выгаднае месцазнаходжанне – цэнтр Лондана. Усё гэта дзякуючы здольнасцям Ораў Фокстрафта эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял прасторы, якога да яго ніхто не бачыў.
Пасля разборкі віядука, які пралягаў праз Усходні Лондан, засталося некалькі секцый вялікіх падпор (15 на 20 м), якія ўтварылі раўнамерную прастору ў тры паверхі над зямлёй. На падпоры паставілі марскія кантэйнеры і вагоны лонданскай падземкі. Так паўстаў працоўны арэал  цэнтра культуры «Вілідж Андэграўнд».




Image © 2013 Bluesky



*Suvilahti, Хельсінкі*

# 20 газавы рэзервуар

*Велізарная прастора перагарнула адну старонку свайго існавання. Што будзе з ёй у будучыні – нявырашана. Але ясна адно: што б тут ні стварылі, гэта будзе незвычайна і варта ўвагі.*



Два велічэзныя рэзервуары для газу спустошаныя, вычышчаныя і даведзеныя да прымальнага тэхнічнага стану, але пакуль што няясна, якое ў іх будзе новае прызначэнне.
Прастора ўсярэдзіне прыгожая, але крыху нязграбная, як і ўсе вялікія памяшканні, збудаваныя для тэхнічных патрэб, без увагі на эстэтычныя вартасці.

<u>*Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна*</u>

# 21 Чыгуначная станцыя

## *«Станцыя» па-ранейшаму функцыянуе як чыгуначная станцыя.*

«Перамовы са Славацкай нацыянальнай чыгункай, каб арэндаваць будынак за сімвалічны кошт, вяліся два гады. Мы былі надта маладыя, каб дзяржаўная ўстанова прымала нас за сур’ёзных партнёраў. Вось чаму прызначаў сустрэчы і нават хадзіў на перамовы бацька Марэка Адамава. Мы пачалі рамонт і аднаўленне ўсяго будынка, маючы на руках кароткатэрміновы кантракт, паводле якога мы маглі заняць толькі адзін пакой. Толькі пазней мы атрымалі кантракт, які дазваляе нам за сімвалічную плату наступныя 30 гадоў карыстацца ўсім будынкам. Кантракт уключае абавязацельства інвеставаць у аднаўленчыя працы як найменей 300 000 еўра».

*Роба Блашка*

Праз прыгарадную станцыю Жыліна-Зарэчча штодня праходзяць сотні чалавек. Кожны, нават той, хто ніколі не заходзіў у будынак на імпрэзу ці па каву, адчувае карысць ад таго, што будынак – установа культуры. Увесь ён чысты і бяспечны, а прылеглая тэрыторыя нязвыкла ахайная, як на шараговую станцыю.
Дзякуючы руху цягнікоў і пасажыраў прастора жывіцца цэлы дзень, і не толькі падзеямі культуры.




FEST
ANČA

<u>*Village Underground, Лондан*</u>

# 22 майстэрні ў вагонах

*Напачатку існавала патрэба аднаго чалавека. Задавальненне гэтай патрэбы нечакана задаволіла патрэбы шырокага кола іншых людзей.*

«Ораў Фокстрафт вучыўся на дызайнера мэблі. Пасля ўніверсітэта высветлілася, што здымаць у цэнтры Лондана памяшканне пад дызайнерскую студыю задорага. Ідэя прыдбаць стары танны вагон і перабудаваць яго пад офісы завялася ў Ораў, калі ён ехаў цягніком у Швейцарыю.

Разам з сарака іншымі творцамі яны пусцілі ва ўжытак чатыры спісаныя вагоны з Юбілейнай лініі Лонданскага метрапалітэна і два марскія кантэйнеры.

Ораў пакуль што не трэба майстэрні, бо ён больш не займаецца дызайнам мэблі – ён зрабіўся дырэктарам цэнтра культуры».

*Амэлі Снаерз*







GEEK

# 23 пляцоўка з піўных скрыняў

*Тэатр пад мостам на 150 месцаў, пабудаваны без дазволу, праходзіць па дакументах у мясцовых органах улады як мастацкая інсталяцыя.*

Матэрыялы:



| 3 000 піўных скрыняў
| 800 пукоў саломы
| 10 м2 вагонкі
| 60 лістоў OSB
| 120 старых шпалаў
| 2 12-метровыя марскія кантэйнеры
| 2 каўшы гліны
| 10 000 цвікоў
| 1 км стрыжня з разьбою
| 1 000 шрубаў
| 1 500 драўляных шрубаў
| 1 коўш жвіру, каб выраўняць зямлю
| 1 падаўжальнік для электрычнага сілкавання
| 2 бочкі
| 1 невялікае рыштаванне
| 100 валанцёраў
| 3 месяцы
| 10 000 еўра

Ужо ў першы год грошы, выдаткаваныя на запрашэнне выступоўцаў, утрая перавысілі кошт канструкцыі.



# 24 Рост

*Ад двухмесячнага фэсту да найлепшага цэнтра культуры ў Еўропе. Пакрысе, сорак гадоў.*

**1970-я**

| Улетку 1970 года «Малачарня» прымала двухмесячны фэст з разнастайнай культурнай праграмай, прыкладна такі, якія яны робяць і цяпер. Тады пляцоўка была значна меншай.

| Пасля інтэнсіўнага фэсту яны на тыдзень зачыніліся, а калі адчыніліся нанова, увесь будынак быў аддадзены месячнай выставе, прысвечанай тэме смерці. Гаворка тады не ішла пра змены ў будынку, яны толькі абнавілі тое, чаго нельга было не абнавіць.

| Яны атрымалі грошы ад гарадскіх уладаў, каб зрабіць рэканструкцыю – прынамсі прывесці ўсё ў адпаведнасць з афіцыйнымі патрабаваннямі бяспекі.

| Пры канцы лета яны зачынілі будынак на цэлы год.

| У 1972 годзе яны атрымалі будынак у доўгатэрміновую арэнду.

| Яны пачалі яго рэканструяваць, гэта заняло 25 гадоў. Спярша рабілі сваім сіламі, кожны рабіў што мог. Яны цалкам перарвалі правядзенне імпрэз на дзесяць дзён, каб засяродзіцца на рэканструкцыі і ўдасканаленнях.

**1980-я**

| У 1980-я атмасфера ў грамадстве памянялася. Амстэрдам змяніўся ўслед, і «Малачарня» змянілася таксама. Цёмны будынак адчыніўся для святла.

| Яны ўсё яшчэ не валодалі ўсім будынкам, таму, калі рэшту будынка выставілі на продаж у 1986 годзе, яны рызыкнулі і залучылі яе пад сваё кіраўніцтва.

**1990-я**

| У 1995 годзе пабудавалі залу на тысячу чалавек і пашырылі ўваход. Усё падвоілася: колькасць прадстаўленняў, публіка, персанал, прыбытак. Быў шалёны поспех.

| Аднак пабудова новых памяшканняў прывяла да таго, што людзі пачалі ўспрымаць будынак падзеленым на дзе часткі: новы (зала, уваход) і стары, які лічыўся менш развітым.

**2000-я**

| У 2000 годзе «Малачарню» цалкам перарабілі. Усе прасторы былі адрамантаваныя на высокім узроўні, і нарэшце іх тэхнічнае абсталяванне стала напоўніцу адпавядаць іх прызначэнню.

| Знянацку стала магчымым ладзіць большыя імпрэзы, запрашаць больш славутых артыстаў.

| Кор Шлёсэр падумаў: «Ну, усё. Будынак нарэшце завершаны, я магу сыходзіць і рабіць нешта іншае». І тут ён убачыў план гарадскога тэатра (іх суседзяў), якія больш не хацелі выступаць у старым тэатральным будынку. Ім патрабавалася новае памяшканне, якое б іх не абмяжоўвала, як абмяжоўвала старое ў будынку, што мае гістарычную каштоўнасць. Ён спытаў архітэктара, які рабіў папярэднюю рэканструкцыю «Малачарні», ці магчыма стварыць прастору недзе паміж будынкам «Малачарні» і будынкам тэатра ў старым горадзе.

| Архітэктар распрацаваў скрыню, якая лунае па-над «Малачарняй».

| Яны пачалі будоўлю ў 2005 годзе, і прастора адчынілася ў 2009. Дзве папярэднія рэканструкцыі каштавалі 2,5 мільёны еўра, а гэтая – 50 мільёнаў.

| Выдае на тое, што гэты будынак – апошні, які можна пабудаваць на такім маленькім лапіку. Усё працуе.

*Занатавана на лекцыі Кора Шлёсэра*

# 24




Melkweg

*Interzona, Верона*

# 25 пярэбары

## *Стасункі з месцам, дзе мы працуем, – важныя. Але каманда – перад усім.*

«Увесь комплекс пабудаваны ў 1920-я гады, за фашыстамі, у часы Мусаліні. Тут захоўвалі тавары, свежыя і замарожаныя прадукты. Будынак, у якім мы цяпер, быў складам. Мы займалі ўсяго лапік прасторы, бо яна выявілася надта вялізная, усё роўна як лабірынт. Мы занялі толькі пэўную частку».

Колькі гадоў назад умовы змяніліся – уладальнік плануе прывесці тут усё да ладу для нейкіх сваіх мэт. «Інтэрзона» мусіць перабрацца ў іншы будынак на тэрыторыі комплексу.

«Спярша было вельмі цяжка развітацца з нашым месцам і пераехаць. Як вы бачыце, гэты склад быў вельмі адметны, тады як новае памяшканне – прастакутнае, абсалютна пустое, і ў нас было адчуванне адчужанасці. Але пакрысе яно нам спадабалася, мы нават палюбілі яго. Проста мы зразумелі, як важна быць згуртаванай камандай. І памяшканне тут – справа дзясятая».

*Ада Ардуіні*







Мы караскаемся праз агароджу і завітваем у незвычайнае памяшканне, якое цяпер пустуе.



# 26 памылкі

| Будаваць гіганцкі цэнтр культуры.
| Мастакі – найлепшыя бухгалтары.
| Не звязвацца з супольнасцю.
| Не зрабіць склада для рэчаў.
| Мець сакрэты адно ад аднаго.
| Не інфармаваць людзей, а здзіўляць іх.
| Папрасіць у спонсараў грошы і больш з імі не кантактаваць.
| Купіць самую маленькую, самую танную і самую старую машыну.
| Ігнараваць гарадскіх праектавальнікаў і архітэктараў.
| Адразу ж завяршыць сваю прастору, каб не трэба было паляпшаць яе потым.
| Пільнавацца правіл і строга трымацца законаў.
| Прыбытак з бара ці крамы? Дзякуй, не трэба.
| Паразмаўлялі – запомнілі, не трэба занатоўваць на паперу
| Рабіць некалькі праектаў адначасова.
| Засяродзіцца на эстэтыцы, а не на змесце.
| Выкарыстоўваць адно памяшканне для ўсіх відаў дзейнасці.
| Не выпрабаваць перад адкрыццём.
| Не арандаваць абсталяванне, а купляць яго.
| Не думаць – адразу адсякаць.
| Не прызначаць дэдлайнаў.
| Не дбаць пра вонкавы выгляд будынка.
| Не пераймацца смеццем на дварэ, бо гэта не ты накідаў.
| Рабіць усё традыцыйным чынам, капіяваць іншых.
| Быць дыктатарам.

*Удзельнікі майстар-класа Living Underground, 2012 год*

*Suvilahti, Хельсінкі*

# 27 калі будзе гатова?

*Калі даробяць будынак?*



«У нас ніколі не было ўлазін. Людзі пытаюць: “Калі будзе гатова?” Ды ніколі! Яно ніколі не будзе гатовае. Яно існуе і, спадзяюся, будзе эвалюцыянаваць вечна».

*Стуба Нікула*


GM200GTT
STARA

# 28 Талака ідэй

*Некаторыя праблемы лепей абмеркаваць з прафесіяналамі. У 2005 годзе цэнтр культуры «Буэнавэнтура» перажываў татальную змену. Цэнтр мусіў пераехаць у новы будынак, а таксама пераасэнсаваць сябе. 59-ы сход ТЕН прапанаваў «Буэнавэнтуры» найлепшых адмыслоўцаў, прадстаўнікоў іншых цэнтраў культуры, якія маглі дапамагчы прыняць рашэнне.*

1.

«Цэнтр культуры Oficina di Buenaventura месціцца на поўначы Італіі, за 40 км ад Венецыі. Кастэльфранка Венета – маленькі заможны гарадок з 30 000 жыхароў.

**Мы маем:**

| Канцэртная зала на 100 месцаў.
| Бар.
| Кватэра з пакоямі для пяцярых валанцёраў.
| Пакой з інтэрнэтам і 12-цю камп'ютарамі.
| Канферэнц-зала, якую таксама можна выкарыстоўваць для гурткоў (танга, тэатральны гурток, фатаграфія, відэа і г.д.).
| Кухня на 40 чалавек.
| Камора».

*Персанал «Буэнавэнтуры»*

**2.**

«Ідэйная талака адбылася дзякуючы абшырным ведам і досведу яе ўдзельнікаў, якія змаглі падзяліцца гісторыямі пачатку сваіх праектаў.

"Буэнавэнтуры" трэба выкарыстаць будынкі, якія ўжо існуюць. Пачаць з маленькага дамка з прылеглай тэрыторыяй і пакрысе развівацца.

**Ім трэба:**

| Тэатр на 200 гледачоў з высокай манеўранасцю яго элементаў, з магчымасцю хутка і лёгка на ўсёй прасторы зрабіць плоскую падлогу.
| 2 грымёркі.
| Памяшканне для музычных імпрэз на 300 стаячых месцаў, прыдатнае і для музычных рэпетыцый.
| Бар/кавярня мусіць стаць ядром цэнтра культуры . Бар мусіць быць здольны абслугоўваць усе прасторы і пераязджаць улетку на падворак.
| 4 майстэрні (для фатографаў, мастакоў, скульптараў ды іншых творцаў).

| Жылыя памяшканні: 10 месцаў для сталага персаналу цэнтра.
| Прыватная кухня для сталых жыхароў.
| 10 гатэльных месцаў для кароткачасовага перабывання.
| Канферэнц-зала на 100 сядзячых месцаў.
| Кухня для фуршэтаў, якая можа абслугоўваць як найменей 100 чалавек.
| Офісы на 20 працоўных месцаў.
| Тэхнічны склад (мінімум 2).
| Асобнае памяшканне для дзіцячых гурткоў.
| Зялёная зона звонку.
| Паркоўка для машын і ровараў».

*Пратакол сходу ТЕН*

**3.**

«Што б вы ні вырашылі наконт будучыні цэнтра "Буэнавэнтура", гэта вашае рашэнне. Тое, што мы прапануем, – гэта толькі нашае бачанне і меркаванні. Мая адзіная рэкамендацыя (я тут трохі перафразую бацьку сацыялізму) –"большасць часу філосафы і палітыкі абмяркоўваюць і спрачаюцца, што не так з гэтым светам, у той час як самае важнае – мяняць яго"».

*Пол Боўген*

**4.**

Стары цэнтр зачыніўся. Новы ніколі не быў пабудаваны, а каманда распалася. Няясна, ці адродзіцца «Буэнавэнтура», ці перародзіцца ў новы цэнтр.

# 29 ліючаяся форма

*З 2003 года чыгуначная станцыя перабудоўвалася шмат разоў. Ужо ясна, што і цяперашні стан не канчатковы.*









# 30 пляцоўкі




Interzona, Верона



Melkweg, Амстердам





Menų spaustuvė, Вільня



Noass, Рыга



Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна

Melkweg, Амстэрдам



Verkatehdas, Хямээнлінна




Pekarna magdalenske mreže, Марыбор



Melkweg, Амстэрдам



Village Underground, Лондан

Melkweg, Амстэрдам



Łaźnia Nowa, Кракаў

# 31 спытай самога сябе

У гісторыі «Станцыі» было два сходы, на якіх былі перагледжаныя пазіцыі ўсіх працаўнікоў, а таксама ўсяго, што прэзентуе «Станцыю», – пераразмеркавалі сферы адказнасці, пераасэнсавалі дзейнасць, місію, агульнае бачанне і планы на будучыню…
Большасць – новыя людзі, каманда расце. «Станцыя» зрабілася самавітай установай, якая вырашае разнастайныя праблемы, і таму структура вызначэння планаў змянілася.

**2004**

| 8 працоўных заданняў
| імпрэзы
| мэтавыя групы
| валанцёры
| дачыненні ў калектыве
| місія
| рэканструкцыя будынка
| размеркаванне абавязкаў
| дыспетчары
| як бачыць сябе «Станцыя» праз 5 гадоў?
| што зрабіць

**2012**

| 14 працоўных заданняў
| чаго нам не трэба на «Станцыі»?
| што нас характарызуе?
| што мы хочам змяніць?
| хто што не хоча рабіць?
| хто за што найперш адказвае?
| місія
| што ў нас атрымліваецца?
| якая ў нас матывацыя?
| чаго мы не робім, але мусім
| новая сістэма кіравання барам
| новая сістэма сходаў
| наша гісторыя
| рашэнні для крызісу прасторы
| структура арганізацыі


майстэрства
пастаяннае ўдасканаленне
эксперымент
прыязнасць
падполле
крытычнае мысленне
адукацыйная праграма
падтрымка творчасці
дызайн
папулярызацыя сучаснага мастацтва і культуры
мастацтва
папулярызацыя прыкладу ўласнай ініцыятывы
пабудова вольнай+творчай прасторы
комплекс пабудоваў
грамадскія будынкі
быць чынным грамадзянінам
злучаючы мясцовае з міжнародным
талерантнасць
актывізм
падтрыманне імпэту ў жыхароў Жыліны
адказнасць
значныя культурныя праграмы
дзеці
гарадское развіццё
сінагога
запаўненне прабелаў
устойлівае развіццё
выкарыстоўваць і развіваць прастору
шматлікая і разнастайная публіка
рост

*Antic Teatre, Барселона*

# 32 парада па абнаўленні

«У 2005-м нас ледзьве не зачынілі за невыкананне норм па бяспецы працы і аховы здароўя. Так пачаўся наш праект па поўным абнаўленні будынка, які ёсць гісторыка-архітэктурнай каштоўнасцю. Мы рабілі з яго тэатр і выводзілі яго ў грамадскае карыстанне.
Рэканструяваць “Антычны тэатр” важна з наступных прычын:
| Адраджэнне раёна: у гэтым раёне, які перажывае змены ў самым цэнтры старога горада, шмат будынкаў не адпавядаюць цяперашнім нормам і знаходзяцца ў вельмі кепскім стане.
| Упарадкаванне аколіц дае раёну новы шанец, а яшчэ яго жыхарам і людзям, якія сюды наведваюцца.
| Тэатральныя мастацтвы: у Барселоне шмат тэатраў, але маладым і эксперыментальным трупам цяжка прабіцца на рынак. З дэмакратычным коштам на квіток і зялёным святлом для артыстаў “Антычны тэатр” адкрыты для інавацыяў і новай публікі.
| Сацыяльны цэнтр: у сваёй першапачатковай форме як “Circulo Barcelonés” цэнтр займаецца культурніцкай дзейнасцю для незаможных слаёў мясцовага насельніцтва. “Антычны тэатр” працягвае трымацца гэтай палітыкі і служыць месцам сустрэчы людзей з раёна.
| На базавы рамонт і аднаўленне пайшло 950 000 еўра. Яны забяспечылі новыя стандарты глядзельнай залы, новыя прыбіральні, паляпшэнне і пашырэнне залы, новую тэрасу, новае абсталяванне і рэстаўрацыю фасада. Наш кантракт, падпісаны ў 2007 годзе, даваў нам 20 гадоў на завяршэнне ўсіх прац

**Спіс зробленага:**

| 1. Канструктыўнае ўмацаванне падлогі на тэрасе, у зале і бары.
| 2. Блакаванне вокнаў у канцэртнай зале, паляпшэнне акустыкі ў зале і ўзмацненне яе жалезнымі бэлькамі.
| 3. Узвядзенне кабіны для тэхнічнага персаналу.
| 4. Рухомая сетка для асвятлення ды іншых патрэб.
| 5. Рэканструкцыя ўсёй тэрасы і сходаў.
| 6. Мужчынскія, жаночыя прыбіральні, а таксама прыбіральня для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.
| 7. Пандус для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, які ў дадатак служыць аварыйным выхадам.
| 8. Безбар’ерны ліфт.
| 9. Новая электраправодка, водаправод і каналізацыя.
| 10. Усталяванне некалькіх пажаратрывалых дзвярэй.
| 11. Апрацоўка на вогнетрываласць.
| 12. Усталяванне пажарнай сігналізацыі і крана для падлучэння пажарнага шланга.
| 13. Усталяванне сістэмы кліматызацыі ў тэатры, бары і фае.



**Мая парада:**

Як адказная за “Антычны тэатр” я апынулася ў вельмі складаным становішчы. Не было досведу ў рамонце будынкаў, не кажучы ўжо нават пра будынкі, якія ахоўваюцца дзяржавай. Я не цяміла ў архітэктурных чарцяжах, рэстаўрацыйных праектах і афіцыйных нормах.



Той, хто хоча здзейсніць змены і адказны за цэнтр культуры, то-бок той, хто падпісвае дакументы, плаціць і з’яўляецца адказным збольшага за ўсё, мусіць старанна вывучыць увесь праект ад дошчачкі да дошчачкі. Нават калі вы не архітэктар і калі гэта па-за межамі вашага разумення, бо вы не спецыяліст, дык усё роўна вы мусіце гэта зрабіць. Прачытайце ўсю дакументацыю некалькі разоў, і тады пачнеце разумець. Трэба будзе знайсці эксперта і тэхнічнага дырэктара праекта. Чалавека, які знаёмы з усімі неабходнымі нормамі, замацаванымі законамі. Каб можна было атрымаць усе дазволы і, як у нашым выпадку, пастаянную або часовую ліцэнзію ад ведамства па абароне навакольнага асяроддзя».

*Сэмалініка Томіч*

# 33 рамонт: дапамагчы справай

«Самае цяжкае – знайсці грошы для будынка (напр., для электраправодкі) і самае лёгкае – для культурніцкай дзейнасці. Для рамонту мы выкарыстоўваем выручку з бара і ахвяраванні. Для рэканструкцыі вам насамрэч грошы не трэба – вам трэба будаўнічыя матэрыялы і людзі. Прасцей шукаць валанцёраў ці кампаніі, гатовыя прэзентаваць будаўнічыя матэрыялы, чым прасіць грошы.

Гэтак мы зрабілі больш за палову нашай рэканструкцыі».

*Марэк Адамаў*





# 34 ▌перадача архітэктурнага бачання

*Майстар-клас, на якім абмяркоўвалі архітэктурныя планы і развіццё «Станцыі» на наступныя 10 гадоў, быў адметны не толькі сваім зместам, але і тым, што яго вынікі былі папулярна сфармуляваныя і выстаўленыя на разгляд шырокай публікі.*

Рамонт старога будынка станцыі яшчэ нават не быў завершаны, як ужо было трэба думаць, што рабіць пасля рэканструкцыі. Якія межы ў «Станцыі»? Як далёка яна можа расці? Мэтай майстар-класа Living Underground было скласці інструкцыю па тэрыторыі, падзеленай паводле плана пабудовы новага транспартнага кола, большасць якой было занята дарогай, чыгуначнымі каляінамі і паркоўкамі.

Усе высновы былі апублікаваныя пасля майстар-класаў у падрабязнай брашуры, аб'ёмная шасціметровая мадэль новай дарогі ўсталяваная на платформе. Яе ўбачылі людзі, якія не ходзяць на імпрэзы і карыстаюцца станцыяй, толькі каб зайсці ў цягнік ці выйсці з яго.

«Трохвымерная мадэль была дужа неабходная. Вельмі важна давесці да ведама людзей, што мы прыдумалі. Вось станцыя, вось транспартнае кола, а вось тут будзе нашая канструкцыя».

*Марэк Адамаў*



























*Menų spaustuvė, Вільня*

# 35 спярша абалонка

*Як пачаць рэканструкцыю? Калі будынак не развальваецца на кавалкі і не патрабуе капітальнага рамонту, варта замкнуць усе адтуліны, каб абараніць будынак ад атмасфернага ўплыву. Дах і фасад у прымальным стане, але ўнутры не мусіць гуляць вецер. І тады можна працаваць усярэдзіне год навылёт.*

Тут будзе хостэл, кавярня і кінатэатр. Першы крок у рэканструкцыі – новыя вокны. Будынак цяпер замкнуты – ніхто з чужых не можа зайсці, і ўсярэдзіну не патрапіць дождж або снег. Парадак звонку, хаос унутры.









# 36 памяншэнне пляцоўкі

*Вялікую прастору заўсёды можна зрабіць меншай.*

Памяшканне, якое раней служыла спартовай залай, завялікае, яго дорага ацяпляць узімку, зашмат метражу, не кажучы ўжо пра высокія столі.

**Часовае рашэнне праблемы**

Штогод залу рыхтуюць да зімоўкі. Будуюцца простыя рыштаванні, якія фіксуюцца на дахавых канструкцыях. Патрэбная прастора будзе абгароджаная тканінай, каб забяспечыць максімальны камфорт, і яе будзе лягчэй ацяпляць.



**Канчатковае рашэнне праблемы**

Канчатковае рашэнне праблемы – пабудаваць пастаянны аб’ект, чые сценкі і столь будуць адступаць ад знешніх сценак і столі.

Паколькі вакол было зруйнавана шмат іншых будынкаў, адтуль можна ўзяць аконныя рамы задарма або за кошт грузаперавозкі і працы. Вось тут наступае самае складанае і цікавае – улучыць момант, калі вокны ў доме ўжо не выкарыстоўваюцца, але дом яшчэ не зруйнавалі.

Як вынік:
| Нізкі бюджэт.
| Паўторнае выкарыстанне рэсурсаў.
| Эксперымент.
| Сацыялізацыя.
| Рэклама.

*Röda Sten konsthall, Гётэборг*

# 37 часовыя перагародкі

*Вялікая прастора дае больш магчымасцяў, чым малая. Нельга ператварыць малое памяшканне ў вялікае, але вялікае лёгка дзеліцца на меншыя.*





# 38 адасабленне публікі ад персаналу

*Шмат тэхнічных праблем можна пазбегнуць, калі адасобіць прастору для наведнікаў ад службовых памяшканняў. Гэта здаецца відавочным, але гэтае правіла ігнаруецца пры ўладкаванні амаль кожнага цэнтра культуры.*

У будынка тэатра «Новая лазня» была перавага – такое адасабленне ў ім было цалкам магчымае.
Канцэртная пляцоўка ў цэнтры прасторы. Левае крыло (вокны ў сад) і пярэдняя частка (вокны на двор) прызначаныя для публікі. Тут можна ўвайсці да залы і бара. Правае крыло (выходзіць на суседнія дамы) і задняя частка ўладкаваныя для персаналу і актораў.



# 39 вузкая пляцоўка

*У малым і вузкім памяшканні праз неэфектыўнае выкарыстанне падходных калідораў колькасць стаячых месцаў можа быць абмежаваная. Зменшыўшы колькасць калідораў, можна дамагчыся аптымальнага балансу.*

«“Антычны тэатр” мае 22 м углыбіню, 5,2 м ушыркі і 4,5 м увышыню. Мы можам пасадзіць 80 чалавек.
Паколькі нашае памяшканне шматмэтавае, нам хочацца, каб мы маглі хутка і лёгка прыбіраць і перастаўляць крэслы без дапамогі тэхнічнага спецыяліста. Найважнейшым для нас было вырашыць праблему доступу публікі, як людзям заходзіць у партэр і як рассаджвацца. Нам не трэба было два праходы між шэрагамі – адзін каб заходзіць і адзін каб прайсці да месца.

Крэслы для гледачоў распрацаваныя для малых памяшканняў, дзе ўлічаны кожны сантыметр, і лёгка здымаюцца. Уся падлога складаецца з рухомых платформ, кожная – 90 см ушыркі. Гэтыя платформы могуць падымацца ці апускацца ўздоўж зафіксаваных абапал рэек. Спярша мы меркавалі, што платформы будуць падымацца на канатных роліках, але ў выніку вырашылі ўсталяваць маленькі рухавік, які мацуецца да столі.

Гледачы заходзяць у партэр і адразу леваруч бачаць сходы. Як толькі яны зайшлі па сходах, ёсць толькі адзін праход, праз які яны могуць зайсці ў свой шэраг і сесці на адмыслова распрацаваныя падушачкі.

*Сэмалініка Томіч*





_Röda Sten konsthall, Гётэборг_

# 40 галерэя ў прамзоне

*Выставы экспануюцца збольшага ў нейтральным асяроддзі. У памяшканні з моцным характарам экспанат і асяроддзе пачынаюць весці дыялог. Што каштоўнейшае, будынак ці экспазіцыя?*

«У нашым “саборы” мы хацелі пакінуць усё як ёсць. Мы не фарбавалі сценак – гэта адна з прынадаў, хацелі захаваць яго індустрыяльны стыль. Гэта вельмі цэніцца, бо галерэі сёння збольшага – белыя скрынкі. Прыйсці сюды і адчуць бетон прамысловай эры – вельмі файна. А для мастака зрабіць тут выставу – выклік».

*Мія Крыстэрсдотэр Норман*





# 41 кратка

*Вялізныя калоны-паралелепіпеды – адзіныя абмежавальнікі прасторы для імпрэзаў у гэтай зале.*









# 42 рухомая мэбля

Прастора неабдымная, падлога гладкая. Сталы, сцэна, шырмы ды іншая мэбля сканструяваныя гэтак, каб адзін чалавек мог хутка і лёгка яе перасунуць.















*WUK, Вена*

# 43 ▌тэатр чорнай скрыні за хвіліну

*Глядзельная зала – нейтральная прастора з зацемненымі сценкамі і столлю, каб уся ўвага засяродзілася на асветленым пражэктарам лапіку – месцы гры актораў. Гэтага дастаткова.*

На столі – кратка для асвятлення і гукавога абсталявання. Сценкі пакрытыя яшчэ адной цёмнай заслонай.

Гэтыя наладкі можна прыбраць у любое імгненне, а будынак, які мае гісторыка-культурную каштоўнасць, застаецца некранутым.





<u>*Not Quite, Фэнгерсфош*</u>

# 44 роўная падлога

*Некаторыя дзіркі лепей запоўніць, чым зацыраваць.*

Колісь тут месціўся нейкі вялікі станок. Такі вялікі і складаны, ажно падлога вакол яго была заглыбленая, каб працаўнікі маглі дацягвацца да прыбораў кіравання, а таксама да тэрмінала здачы-прыёмкі. Пасля таго, як станок прыбралі, падлога засталася шчарбатая.
Сёння падлога гладкая – яе засыпалі жвірам і ўтрамбавалі. Хуткае, таннае і часова эфектыўнае вырашэнне праблемы. Жвір можна дастаць у любы момант і пусціць ва ўжытак нанова.





# 45 тэлескапічныя крэслы

*Прастора, якая можа прапанаваць абсталяванне і выгоды для тэатральнага прадстаўлення, паказу фільма, танцавальных імпрэз, канцэртаў, дзе гледачы сядзяць, канцэртаў, дзе наведнікі скокаюць, карпаратываў, кангрэсаў, здымкаў, – гэта прыбытковая прастора. Каб забяспечыць такі шырокі дыяпазон культурных мерапрыемстваў, трэба мець адпаведнае тэхнічнае абсталяванне.*

Шэрагі тэатральных крэслаў падзеленыя на сектары, якія на механізмах топяцца ў сценкавую панэль. Найбольш часу займае перакуліць кожнае сядзенне ў гарызантальнае становішча. Потым дастаткова толькі націснуць на кнопку, і праз сем хвілін крэслы знікаюць.





# 46 Ацяпленне

*Для цэнтраў культуры, якія знаходзяцца на далёкай поўначы, пытанне ацяплення крытычнае.*

Старая фабрыка прапануе шырокі прастор, але, на вялікі жаль, іх тэхнічныя стандарты адпавядаюць свайму часу ды іх папярэдняму прызначэнню. «Нот Кўайт» пакуль не можа дазволіць сабе ацяпляць будынак цалкам або ўсталяваць ацяпляльную сістэму.
Але ў «Нот Кўайт» толькі 45 удзельнікаў, яны выкарыстоўваюць адно частку будынка. Большасць памяшканняў пустуе. Яны падумалі, што людзі захочуць арэндаваць гэтыя памяшканні пад студыі. І яны сапраўды здавалі іх у арэнду, але толькі ўлетку. Узімку ацяпляць такую абшырную прастору задорага.
Ушчыльненне працоўнай прасторы выявілася эфектыўным рашэннем. Рэзідэнты згуртаваліся ў меншых памяшканнях. Памяшканне папалам, рахунак за ацяпленне – таксама.





# 47 ▌гістарычныя слаі

*Кожны слой будынка нясе сваю гісторыю. Нават той, які раней ніколі не быў бачны воку… Гэтыя сценкі, столі, клямкі, водаправодныя трубы і громаадводы – сведкі пабляклай славы. Да якой ступені іх можна выстаўляць напаказ, залежыць ад здольнасці захаваць іх ад разбурэння.*

«Звярніце ўвагу на падлогу: гэтыя бетонныя штукі для пераплётнай машыны, а потым рэшта падлогі былі пакрытыя металічнымі плітамі 6-7 мм таўшчыні. Пад гэтымі металічнымі плітамі – пашкоджаная падлога.

Дзеля ўмацавання падлогу залілі клеем, а пасля адпаліравалі машынай. Гэтая праца выцягнула ўсе жылы, бо падлога была надта разбітая. Процьма часу сышла, каб адпаліраваць яе. Было б значна лепей пакрыць усё шчытамі MDF і пафарбаваць іх густой фарбай.



Гэтае рашэнне захоўвае гісторыю будынка, а не толькі гэтыя вельмі старыя падлогавыя дошкі. Брыдкасць – таксама частка антуражу, бо менавіта тут працавалі вялікія агрэгаты, якія разбурылі падлогу. Калі мы прыйдзем сюды і памяняем тут усё, зрабіўшы ўсё прыгожа, гэта будзе няправільна. Мы б тады страцілі частку гісторыі. Можа, з эстэтычнага боку тут не надта прыемна, затое з гістарычнага – усё сумленна».

*Леміт Каплінскі*



*Kaapelitehdas, Хельсінкі*

# 48 фальшывыя рэліквіі

*Кожны прадмет выстаўленага напаказ тэхнічнага абсталявання, які выглядае старэйшым за 20 гадоў, аўтаматычна лічыцца аўтэнтычнай рэліквіяй.*

«У нас у будынку не засталося старых кабельных машын – іх папрадавалі, павывозілі або паразбівалі, – але людзі ўсё роўна пытаюцца: “А дзе ўсе кабельныя машыны?” А ў нас іх няма! Але калі мы аднавілі два апошнія старыя ліфты, то выцягнулі гэтыя запчасткі. Гэта старыя ліфтавыя рухавікі, і я думаю, 90 % людзей, мінаючы, думаюць – ну, калі ласка, вось і кабельная машына!»

*Студа Нікула*





# 49 абнаўленне, затым тэндар

*Мясцовыя ўлады абвесцілі конкурс, каб выбраць кампанію, якая будзе распараджацца памяшканнем. Пераможца атрымлівае магчымасць высунуць свае ідэі стасоўна рамонту і аднаўлення будынка.*

«Тут ладзіліся прадстаўленні, кангрэсы, сходы – усё ў такой манеры. Недзе ў 1990-я будынак зачыніўся, бо выявілася, што ў даху поўна азбесту. Прайшло 20 гадоў, перш чым удалося аднавіць будынак і зрабіць, каб усё зноўку запрацавала. Калі мясцовыя ўлады нарэшце ўсё падрыхтавалі для ўжытку, яны абвесцілі адкрыты тэндар, каб знайсці арганізацыю ці прыватную фірму, якая зможа тут усё заарганізаваць. Мы ўзялі ў ім удзел і перамаглі.

У мясцовых уладаў завялася разумная ідэя прытрымаць невялікія бюджэт для абсталявання. Яны абвесцілі публічны тэндар і, даведаўшыся, якая суполка перамагла, вылучылі гэты малы бюджэт. Вядома, крыху іншая справа, калі б тут была канцэртная суполка, якая займалася б пераважна музыкай. Паколькі ў нас кампанія, якая спецыялізуецца збольшага на тэатрах, мы папрасілі пабудаваць нам сцэну».

*Фэдэрыка Рокі*

# 50 камітэт па абнаўленні

«Мы арганізавалі камітэт, які ў працэсе рэканструкцыі служыў прафесійным дарадцам стасоўна тыпаў дзейнасці, якія адбываюцца ў "Пякарні". Мы зладзілі даследаванне ў горадзе – якія тыпы дзейнасці патрэбныя, няважна дзе, дзейнасць, якой яшчэ не было. Мы склалі гэтыя слаі разам, і гэта быў пункт адліку, і гэта былі парады для архітэктараў. Мы зрабілі падсумаванне таго, што адбываецца, чаму ўсё адбываецца гэтак, чаго варта пазбягаць, і яны сфармавалі сваё ўласнае меркаванне.

З першым будынкам нічога не атрымалася.

Рэшта выйшла не такая кепская. Усё зроблена архітэктарамі з Марыбора, якія наведвалі імпрэзы ў "Пякарні", таму яны ведалі месца дзеяння і ведалі тутэйшыя патрэбы».

*Борут Вэнцэль*

# 51 галоўны падрадчык

*Калі сродкаў хапае, каб зрабіць рамонт і рэканструкцыю спецыялізаванай кампаніяй, – гэта проста фантастыка!*

«Мяне тут не было тры тыдні – і такія вялікія змены! Здзіўляюся на кожным кроку. Зірні! Тут маленькі гаўбец! Яго толькі што зрабілі!»

*Агата Этмановіч*

Рамонт стаў магчымым дзякуючы структурным фондам у супрацоўніцтве з мясцовымі ўладамі. Нешта кшталту гранта: мусілі абвесціць тэндар – і з'явіўся прафесійны падрадчык для ўсяго. Датрымаліся ўсіх нормаў. Па тэрыторыі будоўлі можна хадзіць толькі ў касцы і ў камізэльцы з флікерамі.


SKANSKA


LIEBHERR



# 52 поўны сэрвіс

*Самадастатковасць у пэўных прафесійных пытаннях ашчаджае грошы. Але некаторыя рэчы лепей пакінуць староннняй арганізацыі.*

Цясляр-слесар, уладальнік сваёй майстэрні, паказвае нам няскончаны стальны стэлаж для вінных келіхаў, які неўзабаве ўсталююць па-над барам. Яны могуць рабіць амаль што ўсё – рыштаванні для прадстаўленняў, выштукаваныя маленькія прылады. У іх ёсць свая група працаўнікоў, якія ў стане зрабіць большасць будаўнічых прац. Цяпер «Бакеліт» займаецца аздабленнем найбольшай залы, ангара. Я пытаю Мартана Баўэра, ці ж будаўнікі, якіх я бачыў на вільчаку даху, з яго групы? Яго адказ «не»: «Ізалявальнікі – са старонняй кампаніі, бо яны працуюць на 8-метровай вышыні. Мы не хочам, каб нашыя людзі паваліліся».



*Menų spaustuvė, Вільня*

# 53 **безбар’ернасць**

*Дазволіць людзям з абмежаванымі магчымасцямі дабрацца да любой часткі будынка – азнака ветлівасці і выхаванасці.*

Паміж пляцоўкай, месцам выхаду з ліфта і рэштай памяшкання – метровы перапад у вышыні. Для здаровага чалавека – усяго чатыры прыступкі, але для людзей з абмежаванымі магчымасцямі – непераадольная перашкода. Праблема вырашаецца пры дапамозе пад’ёмніка.





# 54 адзіны адрамантаваны будынак

*Комплекс складаецца з пяці будынкаў. Толькі адзін з іх адрамантаваны – паводле агульнапрынятых будаўнічых стандартаў. Тым жа часам грошы на рэканструкцыю ад Еўразвязу зніклі.*

«Хостэл – грамадская ўстанова. Каштавала дорага. Тыповая сітуацыя. Калі гарадскія ўлады аднаўляюць будынак, у іх абсалютна іншыя разуменні якасці. Гэты будынак быў у катэгорыі “ўстанова грамадскіх паслуг”, дзе прадпісана, якія тыпы крэслаў павінны стаяць, якая мэбля. З іншага боку, у самым канцы, калі нехта сапраўды павінны быў выбраць крэслы, рабіў гэта заўсёды нейкі ёлуп.

Гэта адзіны будынак, дзе ўсталяваныя камеры бяспекі. Да яго нельга дакранацца. Інакш цябе, магчыма, аднойчы арыштуюць».

*Борут Вэнцэль*





# 55 брама

*Уваход у залу можа быць падзелены на некалькі маленькіх дзвярэй, праз якія мы патрапляем у свой сектар залы. Ці гэта можа быць адна вялікая брама, якую нават не ўспрымаеш як прагал у сцэнцы і якая інтэгруе фае з глядзельнай залай.*

Масіўная брама вядзе з глядзельнай залы наўпрост у фае і праз уваход адразу да галоўных дзвярэй. Яна можа знікнуць за некалькі імгненняў.







# 56 вестыбюль

Прастора паміж канцэртнай і канферэнц-залямі, якая раней, калі завод працаваў, была знадворку, цяпер крытая шкляным дахам. Праз свае памеры яна можа быць раскошным вестыбюлем або трэцяй, цалкам абсталяванай залай.

Фасад з хвалістага жалеза з аднаго боку, цагляная сценка з сеткавым малюнкам – з іншага. На бетонную падлогу нанесена чорнае кола, якое разам з другім колам на фасадзе стварае мастацкую кампазіцыю. Вокны шматпавярховай часткі, якая злучаецца з заламі, закрытыя паліграфічнай фольгай са здымкамі, якія выяўляюць відарысы тых часоў, калі завод выконваў сваю першапачатковую функцыю.





*Menų spaustuvė, Вільня*

# 57 **шатня**

*Дасканалае, але, на жаль, толькі часовае рашэнне праблемы.*

Увесь будынак з мэбляй і абсталяваннем распрацаваны і сканструяваны паводле высокіх стандартаў, з якаснымі матэрыяламі і рупліва даведзены да ладу.
Вельмі шкада, што гэтая неймаверна зручная і кампактная шатня не надта пасуе будынку і, верагодна, будзе замененая больш прыдатнай.








42
126
125
129
41
41
129

# 58 сцежкі

*Патрапіць з пункту А ў пункт Б не заўсёды проста.*

Для тых, хто арыентуецца на месцы, праблемы не ўзнікае, але для тых, хто прыйшоў упершыню, увечары, пад дажджом, або для тых, хто не бачыць як след, можа быць цяжка. Пагоршыць сітуацыю можа наяўнасць паміж А і Б пунктаў В, Г, Д. Таму варта падумаць пра навігацыйную сістэму – і чым прасцей, тым лепей.

Побач з трапам, які вядзе на карабель, вісіць шкляная рама з культурнай праграмай на наступны месяц. Кожная імпрэза абведзеная розным колерам, адпаведна месцу правядзення. Зялёны для рэстарана, жоўты для канцэртнай залы, блакітны для галерэі, чырвоны для тэрасы на даху. На падлозе таксама намаляваныя рысы – траекторыі, якія пачынаюцца на гэтым пункце і вядуць да адпаведнага памяшкання.







A38
A VILÁG LEGJOBB KLUBJA

*Verkatehdas, Хямээнлінна*

# 59 інфаграфіка

Як прайсці ў прыбіральню?
Дзе шатня?
Куды вядуць гэтыя дзверы?
У якім пакоі я знаходжуся?
Дзе можна памяняць памперс дзіцяці?
Што знаходзіцца на трэцім паверсе?
Куды вядуць сходы?

Інфаграфіка вырашае праблему.






OFFICE


WC
741-1040
981-1040


KOKOUSHUONEET
1,2,3
STUDIO
SALI
A


VANAJA-SALI
YLÄLÄMPIÖ
UPPER FOYER
YLÄPARVI
UPPER BALCONY

# 60[1] сувязь з рэзідэнтамі, якія параязджаюць

*У «Кабельным заводзе» мноства майстэрняў, арандатары ўвесь час высяляюцца, засяляюцца або мяняюцца памяшканнямі.*

**Паштовыя скрыні**

«Сталыя рэзідэнты маюць тут паштовыя скрыні. Аканому ўвесь час паступаюць заяўкі, і калі нехта мае патрэбу ў большым ці меншым памяшканні, то прыгажосць у тым, што мы звычайна можам задаволіць просьбу цягам шасці месяцаў. Кожны раз, калі нехта з'язджае або заязджае, а нехта патрабуе большае або меншае памяшканне, мы кажам: добра, давай памяняем вас месцамі. Тут ёсць арандатары, якія паспелі папрацаваць у пяці розных майстэрнях у нашым будынку, але адрас застаўся нязменным. У іх адна і тая ж паштовая скрыня».

*Stuba Nikula*



# 60²

**Шыльда з назвамі**

Калі замацаваць на ўваходзе адну вялікую шыльду з назвамі і месцазнаходжаннем рэзідэнтаў у будынку, яна вельмі хутка зробіцца неактуальнай.

Графічная дошка падзеленая на сетку меншых квадратаў-магнітаў, якія лепяцца да жалезнай асновы. Кожны раз, калі нехта заязджае, з'язджае або мяняецца месцамі, дастаткова замяніць адзін стары квадрат на новы.



*ufaFabrik, Берлін*

# 61 сонечныя батарэі

*Выкарыстанне фотаэлементаў цягам апошніх 20 гадоў.*

«Мы пачалі ў 1992 годзе. На той час у нас быў самы вялікі дах з сонечнымі батарэямі ў Берліне – 500 кв. м. Праз некалькі гадоў мы пабудавалі эксперыментальнае поле для развіцця новых сонечных батарэяў. Напрыклад, тонкая фотаплёнка або рухомая сістэма. Праблема ў тым, што, калі панэль усталяваная на даху, сонца ходзіць па небе і панэль вырабляе няшмат энергіі. Апоўдні энергіі найбольш, але яе меншае ўвечары. Таму мы падумалі пра паваротныя панэлі.

Мы знайшлі сістэму, якую рэгулюе камп’ютар, і панэль ведае, дзе знаходзіцца сонца, а матор ссоўвае яе ў тым кірунку. Мы не будзем уключаць камп’ютар. Як уключыць матор? Ёсць дзве маленькія сонечныя панэлі абапал вялікай сонечнай панэлі, якія стаяць строма. Калі сонца на баку меншай панэлі, матор перасоўвае яе ў правільную пазіцыю без дапамогі камп’ютара.

*Werner Wiartalla*





# 62[1] пажарны выхад

*У кожнай краіне тэхнічныя правілы патрабуюць пэўнай колькасці запасных выхадаў на выпадак пажару. Калі выхадаў недастаткова, тады правілы патрабуюць:*

*| а) або знізіць да бяспечнага ўзроўню максімальную колькасць гледачоў, якую можна размясціць у памяшканні;*

*| б) або пабудаваць дадатковыя пажарныя выхады.*

«У нас сур'ёзная праблема са змяшчальнасцю залы. Шырыня сходаў на 10 см меншая, чым трэба, таму па іх не могуць адначасова ўздымацца два чалавекі. Дазволеную колькасць гледачоў трэба зніжаць да 250, а гэта, у сваю чаргу, б'е па кішэні. Людзі тэлефануюць і дасылаюць электронныя лісты штодня – яны хочуць узяць у арэнду залу, для нас зала – добрая крыніца заробку.

Але паколькі нешта рабіць у зале надта дорага, трэба змяншаць напаўняльнасць залы. Сходы абмяжоўваюць колькасць гледачоў праз пажарныя нормы».

*Мія Крыстэрсдотэр Норман*



# 62²



Пажарны выхад на дах у хостэле

*Tabačka kulturfabrik, Кошыцэ*

# 63 вентыляцыя

Калі горача і немагчыма ахаладзіць паветра, дык прынамсі дазвольце яму цыркуляваць па памяшканні.






*Korjaamo, Хельсінкі*

# 64 вертыкальны сад

У цэнтры будынка, куды не трапляе дзённае святло, сталы абступае вертыкальны сад.
Угары святло, якое замяняе сонца. У лямцавых торбах – грунт для раслін. Знізу шырокая ёмістасць для збору вады.









# 65 аб’яднанне

**Сітуацыя**

| Ёсць лес.

| Няма шашы.

| Фабрыку пабудавалі ў 1795-м для чыгуннай прамысловасці, у XIX стагоддзі яе пераабсталявалі ў папяровую фабрыку.

| Да пабудовы фабрыкі тут нічога не было, вёска паўстала вакол вытворчасці.

**Вучэльня**

| Stenebyskolan – вышэйшая школа прыкладнога мастацтва ў Далсландзе (170 км ад Гётэборга) – была заснаваная ў 1934 годзе. Тут рамесніцкія і дызайнерскія праграмы (бакалаўрыят і магістратура). Спецыялізацыя – дызайн драўлянай мэблі, металічных і тэкстыльных вырабаў для грамадскай прасторы.

**Прыбыццё**

| 10 гадоў назад выпускнікі шукалі месца, дзе можна працягнуць сваю працу.

| Патрабаванне: танныя майстэрні, дзе можна жыць і ствараць.

| Прычына: перавагі кааператыўнай працы.

| Спачатку тут было 10 чалавек.

| Спярша ўсе ўзялі ў банку крэдыт па 2 000 еўра як забеспячэнне для атрымання іншага бюджэту.

| Была дапамога ад шведскага цэнтра занятасці насельніцтва.

| Праз некаторы час сфармавалася структура, якая працавала, ды пацягнуліся іншыя людзі, каб заарандаваць тут памяшканне.

| Карл якраз падаў заяўку, каб далучыцца, і заплаціў унёскі.

| Праз пару гадоў першапачатковыя ўладальнікі перапрацаваліся. Яны так цяжка цягнулі жылы, што ім ужо было не да супольнай працы.

| Чаго варта асцерагацца:

1) выжыльванне на працы;
2) нядбалая бухгалтэрыя.

**Змена ўладальніка**

| Яны стварылі аб’яднанне, абмеркаваўшы, што кожны ў групе арэндадаўцаў можа стаць уладальнікам за невялікую плату. Такім чынам, цяпер там 45 суўладальнікаў.

**Village**

| People in the village have a strong relationship to the building.

| Most of them think it's really good what we are doing here.

| They rent our part from a private owner who inherited it from her grandfather.

| We have a good relationship, but sometimes it is quite complicated.



**Сёння**

| Некаторыя часткі фабрыкі паранейшаму пустуюць.
| Not Quite адчынены круглы год, ад панядзелка да пятніцы, з 12:00 да 18:00.
| Узімку не так шмат наведнікаў, але ўсё роўна вельмі важна, каб любы наведнік адчуў, што прастора адкрытая для публікі.

*занатавана на лекцыі Карла Гальбэрга*



# 66 **прамысловая і культурніцкая вытворчасць**

*Зрабіць цэнтр культуры з дзейнай фабрыкі і падтрымліваць яе ў працоўным стане – гэта выдатна.*

«У лістападзе 2003 года гэтая фабрыка рабіла тэхнічную паперу. Шчыра кажучы, калі я зрабілася тут дырэктаркай, фабрыка знаходзілася не ў найлепшым стане. Былі праблемы з працаўнікамі, бо мы не мелі грошай плаціць заробкі, а таксама бракавала пакупнікоў нашай паперы. Я прыйшла да высновы, што трэба перайначыць дзейнасць і, магчыма, скараціць вытворчасць паперы. Я пачала працэс трансфармацыі і найперш пазбавілася ад некаторага абсталявання. Тады высветлілася, што ў нас досыць шмат прасторы, якую мы не выкарыстоўваем для вытворчасці.

Я вырашыла прыстасаваць гэтыя памяшканні для імпрэз з выкарыстаннем матэрыялаў, якія мы можам рабіць на фабрыцы. Першым чынам мы адкрылі выставачную залу ў 2005 годзе. Стуль мы пачалі развіваць працэс, і цяпер у нас тры выставачныя залы, зала для тэатральных прадстаўленняў, а таксама супольная майстэрня для тых, хто прыехаў на творчую рэзідэнцыю, а ў дадатак шмат-шмат студыяў і офісаў для арганізацый, якія працуюць у творчых індустрыях.

Не было ніякай змены кірунку. Проста так склалася, што ўсе мае зацікаўленні палягалі ў галіне культуры і мастацтва».

*Ася Філіпава*

*NELK, Тарту*

# 67 жывы музей

*Найлепшы спосаб дэманстраваць мінуўшчыну будынка – зрабіць яе цяпершчынай.*

Мы заходзім у друкарскі цэх. З першага погляду ён падаецца чарговым музейным памяшканнем, але па каторым часе я заўважаю, што на некаторых станках яшчэ не высах атрамант. Некалькі дзяўчат увіхаецца ля машын. Тут процьма кнопак і вагароў, але дзяўчаты дакладна ведаюць, на што трэба націскаць. Машыны чыстыя, ахайныя, і нягледзячы на наш прыход, іх праца працягваецца.






Fyffes



# 68 ліхія часы

«Калі я зрабіўся першым дырэктарам установы "Магдаленская пякарня", дык першы год я быў заняты толькі тым, што выганяў з будынка наркаманаў. Двойчы я выклікаў паліцыю, бо была наўпроставая небяспека майму жыццю – на мяне фактычна палявалі. Барыг я не пераносіў на дых.
Парк ад самага пачатку быў сумнеўным месцам. У 1990-я тут быў падпольны рынг з нелегальным таталізатарам, шмат наркотыкаў, нават нехта памёр у адной з прыбіральняў. Усё гэта стварыла адмоўную рэпутацыю – яе шлейф цягнецца аж да сёння
Для месца гэта стыгма. У барах у нас было некалькі ахоўнікаў, бо там было напраўду небяспечна. Па пятніцах людзі, якіх я ведаў, заходзілі ў бар, і пасля маёй просьбы яны здавалі мне пісталеты. Я хаваў іх і вяртаў ім іх перад сыходам. Бойкі тады былі звыклай з’явай. Кроў і паліцыя. "Хуткая дапамога" і гэтак далей. Ліхія часы.

*Пакуль ты не маеш месца, бяспечнага настолькі, каб зранку туды маглі прыходзіць дзеці, працаваць нармальна немагчыма».*

*Борут Вэнцэль*

# 69 часткова адчынена

*Заканчэнне рамонтных прац па пераўтварэнні сінагогі ў выставачную залу далёка на гарызонце, але выстава ўжо працуе дзякуючы «частковаму адкрыццю». На пару дзён перапынілі рамонтныя працы, усе небяспечныя зоны абплялі стужкай з папярэджаннем і ненадоўга адчынілі памяшканне для наведнікаў.*

Нікога не хвалюе, што шмат дзе няма праходу і што прыбіральняў не стае. З кожным такім частковым адкрыццём будынак усё больш і больш ператвараецца ва ўстанову культуры – у сінагогу і выставачную залу. Дзякуючы такому аднамаментнаму існаванню ўражанні ад выставы толькі мацнеюць. У іншы раз ужо ўсё будзе па-іншаму.




RESPONSABILITY
FREEDOM OF
EXPRESSION
EUROPE
EUROPE
POLITICS
HISTÓRIA
HOPE
SVET

*Korjaamo, Хельсінкі*

# 70 боксы ў адкрытай прасторы

*Для некаторых відаў дзейнасці падзеленая на меншыя адсекі прастора – тое што трэба.*

«Дэпо» займае дзве вялізныя залы.
Леваруч заходзіцца меншая з дзвюх – з двухузроўневым барам, офісамі, кнігарняй, рэцэпцыяй, выставачным памяшканнем і канферэнц-заламі. Усё, апроч хола, – прасторы, для якіх першапачатковы пусты хол быў завялікі.
Прастору падзялілі, уштукаваўшы боксы. Яны падзеленыя на два ўзроўні, што робіць іх структурна ўпарадкаванымі. Культурная дзейнасць падзеленая паміж боксамі і прасторамі між імі. У кожнага бокса сваё прызначэнне. Кожны бокс унікальны, створаны для сваёй мэты. Некаторыя маюць шкляныя сценкі, іншыя зацемненыя. Некаторыя ўвесь час адчыненыя, іншыя замкнутыя.








NEUVONTA
KASSA







# 71 музей, пляцоўка для імпрэз, рэстарацыя

*Для некаторых відаў культурнай дзейнасці вялікія прасторы можна зрабіць яшчэ большымі.*

«Дэпо» займае дзве вялізныя залы.
Праваруч знаходзяцца вестыбюль і вялікае памяшканне, падзеленае на тры адсекі важкімі заслонамі. У цэнтральнай частцы – праход у сярэдзіну будынка, іншыя памяшканні – прылеглы да падворка рэстаран і музей трамваяў, вокны якога выходзяць на вуліцу.
Заслоны, якія адасабляюць, могуць адсоўвацца – і шматпакаёвае памяшканне ператвараецца ў адзіную прастору.







# 72 ▌прылады

*Прылады і механізмы яны пакінулі. Да іх яны патрапілі бясплатна і ў добрым стане.*

«Мы сабралі ўсё, што было ўсярэдзіне. Тут месцілася вучэльня для слесараў па метале і электрыкаў. Большасцю прыладаў з вучэльні мы карысталіся, калі будавалі тэатральныя дэкарацыі або майстравалі прадметы для нашай прасторы.

З іх дапамогай я зрабіў асвятленне ды ўсякае-іншае. Калі мы зрабілі экспазіцыю ўнутры, дык мянялі прастору ўвесь час, і таму прылады нам спатрэбіліся… Да прыкладу, гэтая печка, прамысловая. Мы распалілі яе, каб растапіць гэтыя пластмасавыя плешкі для ліхтароў».

*Маўрыц'ё Бутаца*





# 73 лябёдка

*Стары механізм на закінутым заводзе? Цалкам верагодна, ён працуе.*

«Лябёдка выкарыстоўваецца амаль на кожнай імпрэзе. Яна функцыянуе і перыядычна праходзіць тэхагляд. Па гэтым даху вы можаце пераносіць сотню тон. На кожнай калоне – тры-чатыры такелажныя вузлы. Аднойчы была штогадовая вечарынка адной газеты і на крук падвесілі аўто. У пэўны момант падчас прадстаўлення аўто пачало рухацца!»

*Стуба Нікула*





*WUK, Вена*

# 74 **майстэрні**

*Майстэрні цалкам аснашчаныя і даступныя для ўсіх, хто можа даказаць, што не нанясе сабе шкоды, калі будзе працаваць з прамысловымі машынамі.*

«Задума была сабраць разам працаўнікоў культуры, але ў дадатак людзей, якія працуюць рукамі, скажам, цесляроў. Гэтай групе людзей, якой моцна хацелася захаваць будынак, заўсёды былі ўласцівыя разнастайныя зацікаўленні.

Калі вы зацікаўленыя нешта зрабіць, дык вам варта толькі прыйсці на агульны сход і папрасіцца да іх.

Калі ты хочаш працаваць, ты адно мусіш давесці, што ўмееш карыстацца станкамі».

*агульныя заўвагі падчас экскурсіі*









# 75[1] пякарня

*Адкрыць эка-пякарню згодна з прынцыпамі незалежнай культурнай дзейнасці: не для прыбытку, а ў мэтах культуры. З такімі высокімі патрабаваннямі да якасці, а таксама выкарыстоўваючы мясцовыя прадукты і ўжываючы свойскія метады выпякання, зарабіць немагчыма. Гэта аднолькава слушна як для Берліна, так і для шведскай вёскі.*

«У нас з’явілася цудоўная ідэя пабудаваць пякарню, каб рабіць экалагічны хлеб, назапашваць прыбытак і выдаткоўваць яго на культуру і мастацтва. Нават не спрабуйце – гэтая схема проста не працуе! Мы радыя, калі пры канцы года пякарня выходзіць “у нуль”.

Хлеб, вядома, смачны. Але з такімі высокімі стандартамі якасці зарабляць немагчыма. Усё ж свойскае, ніякіх аўтаматычных ліній, а сыравіна мае сваю цану».

*Зігрыд Німэр*





«Доўгі час пякарня была маёй запаветнай марай. Тут гэта добры дадатак да мастацтва і рамесніцтва. Увесь хлеб, што мы пячэм, экалагічна чысты і зроблены з мясцовай мукі.
Гэта наш першы год. У Швецыі ўтрымліваць маленькую фірму па вытворчасці такога хлеба – дарагое задавальненне. Але зарабіць шмат грошай не нашая мэта. Нам падабаецца цешыцца жыццю і рабіць тое, у што мы верым, а таксама працаваць з добрымі людзьмі, каб сэрца радавалася. Вось што самае галоўнае для мяне і для ўсіх, хто працуе тут. Я вельмі радая, што ўсё атрымалася. Калі я пачынала, дык трохі трывожылася. Божа, я збанкрутую, пякарня сябе не акупіць! Але ўсё выйшла найлепшым чынам, нават лепей. Тут 400 жыхароў і мы можам працаваць круглы год. Мы адзіная пякарня, якая робіць такі від хлеба ва ўсім Далсландзе. Найбліжэйшая падобная пякарня – за 200 км адсюль. Мы досыць адметныя.
У Гётэборгу я мела кавярню і сад, дзе раслі экалагічна чыстыя зёлкі. Калі я нарадзіла, дык пераехала дадому. Потым знайшла гэтае месца. Добрая зачэпка, каб пачаць абжывацца. Тут пануе прыязная атмасфера, вось чаму мне захацелася сюды вярнуцца.

Шмат хто ў Швецыі кажа, маўляў, на вёсцы няма працы. Але калі ў вас ёсць ідэя, калі вы дзёрзкі, калі маеце процьму энергіі, пазітыўнае мысленне і да таго падобныя перавагі, дык усё можа атрымацца. Я хачу натхняць людзей, на сваім прыкладзе паказваць ім, што гэта магчыма».

*Сандра Отасан*

# 76 іранская бібліятэка супрацiву

*За тысячы кіламетраў ад Ірана існуе пляцоўка інтэлектуальнага супраціву, якая не мае магчымасці даць свой голас на бацькаўшчыне, аднак тут знайшла сваё месца.*

Ад самага стварэння WUK на верхнім паверсе месціцца адна з самых вялікіх іранскіх бібліятэк у Цэнтральнай Еўропе.
Пасля змены рэжыму ў Іране пануе вельмі моцная цэнзура. У бібліятэцы назапашваецца літаратура, напісаная іранскай іміграцыяй і падполлем. Кнігазбор налічвае 5 000 асобнікаў, большасць з якіх – палітычныя тэксты пра становішча ў Іране. Людзі са Славаччыны, Нямеччыны ды Італіі прыязджаюць сюды, бо ведаюць: тут яны знойдуць кнігі, якія немагчыма здабыць у іншым месцы.


پرنده نو پرواز
پیتر اوانز
توسعه یا چپاول
نقش دولت در تحول صنعتی
همهٔ مردان شاه
استیفن کینزر
ترجمهٔ شهریار خواجیان
نشر اختران
Hedayat
The Pearl Cannon
Mazdâ
سعید سلطانپور
روشنگران از مزدک تا امروز
سعید سلطانپور
روشنگران از مزدک تا امروز
هفت برادر
آلکسیس کیوی
کتاب پژوهش کارگری
شماره ۶
بهار ۲۰۰۲
تاریخ اندیشه‌های سیاسی قرن بیستم
حسین بشیریه
نشر نی
ملی گرایان و افسانه ی دموکراسی
بهزاد کاظمی

*Pekarna magdalenske mreže, Марыбор*

# 77 кнігарня

Адно з памяшканняў у «Пякарні» – кнігарня, месца, куды трапляюць кнігі, калі ў бібліятэках іх мяняюць на новыя або калі зачыняюць усю бібліятэку.

«Мы атрымліваем кнігі выключна ў падарунак і потым прадаем іх. Цана 1-2-3 еўра за асобнік. 700 000 асобнікаў!»

*стваральнік Bukvarna Ciproš*





*Manifatture Knos, Лечэ*

# 78 **веламайстэрня**

*«Усё вельмі проста. Вам трэба памяшканне, пара зламаных ровараў, нейкія прылады, адзін ці два добраахвотнікі – і ўсё гатова.*

Тут вы можаце навучыцца рамантаваць ровар самастойна. Усё на самаабслузе. Нельга прыйсці сюды з роварам і сказаць, маўляў, наладзьце мне яго. Але ж можна навучыцца спраўляць яго тут самастойна. Тут ёсць валанцёры, якія дапамагаюць рамантаваць. Тут таксама можна пакінуць ровар, на якім вы больш не катаецеся. Яго завязуць на склад, або вы, калі захочаце, можаце пабудаваць ровар незвычайнай формы».

*Андрэа Альба*




CiclOffiCina
BALLISTIC

# 79 кухня

*«Усё вельмі проста. Вам трэба памяшканне, пара зламаных ровараў, нейкія прылады, адзін ці два добраахвотнікі – і ўсё гатова.*

Тут ёсць студыі, офісы і жылы паверх, але кухня – тое месца, дзе ўсе ў ОЗУ збіраюцца разам. Часам у іх тут майстар-класы, курсы або каштаванне страваў.
Яна гіганцкая, з кніжнымі паліцамі, віном і прадуктамі. Пукі зёлак і перцаў звісаюць са сценак, бочкі са свойскім алеем займаюць ніжнія паліцы.
Пліта і доўгі кухонны стол стаяць адасоблена, побач з абедзенным сталом. Калі людзі стаяць вакол іх, дык яны патрапляюць у цэнтр увагі: нехта кроіць, нехта памешвае, трэці мые і шкабліць, чацвёрты пячэ, а пяты, шосты і сёмы даюць парады. Пліта – гэта сцэна, абедзенны стол – публіка.









# 80 шум

*Часам імпрэзы праходзяць шумна і гэта раздражняе суседзяў. Калі фізічна немагчыма сціішыць гук, з суседзямі трэба неяк дамаўляцца.*

«Шаноўныя суседзі "Станцыі Жыліна-Зарэчча"! Шаноўныя сябры!
Прыйшло лета, а разам з ім культурніцкія імпрэзы на вольным паветры. Яны нясуць добры настрой і радасць, але раз-пораз таксама шум, якога цяжка пазбегнуць.
З гэтае нагоды мы і пішам да вас. Хочам папрасіць вас быць цярплівымі бліжэйшыя дзве суботы-нядзелі – усяго толькі два канцатыдні за ўсё лета! – пакуль "Станцыя" будзе прымаць летнія фэсты.
На абодвух фэстах адбудуцца вечаровыя канцэрты і ў садзе будуць граць дыджэі. Мы не хочам моцна шумець, але гук, цалкам верагодна, можа перавысіць дазволеныя межы.
Калі ласка, не выклікайце паліцыю ў тую ж хвіліну. Астатнія шэсць ці сем пар выходных мы зможаце цешыцца цішынёю. Мы пастараемся, каб музыка гучала як мага цішэй і не перавышала дазволеных межаў. Пасля леташніх выпадкаў мы вырашылі напісаць вам загадзя і прыйсці да пагаднення… Гэта не вельмі прыемна – сустракаць паліцыю ў самы разгар фестывалю.

Або давайце зробім інакш – прыходзьце да нас! Культурніцкая праграма фэсту далучаная да гэтага ліста, а ў дадатак – бясплатны білет на адно з прадстаўленняў».

*Ліст да навакольных жыхароў «Станцыі Жыліна-Зарэчча»*

# 81 **святло**

*Каб пачуцца ў бяспецы, нам трэба кантраляваць наваколле, бачыць, што адбываецца каля нас, і адначасова быць бачнымі іншым.*

«Тут вельмі цёмна. Для рэстарацыі мы зрабілі вокны, гэта было два гады таму. Будынак квадратнай формы, вельмі аб'ёмны, і шмат людзей палохаецца – яны баяцца прыходзіць, яны не ведаюць, што гэта такое, не разумеюць».

*Мія Крыстэрсдотэр Норман*

# 82 бары



Interzona, Верона




Antic Teatre, Барселона



Kaapelitehdas, Хельсінкі



Melkweg, Амстэрдам




Village Underground, Лондан




DOM La Cupola Del Pilastro, Балоння




Bakelit MAC, Будапешт



Manifatture Knos, Лечэ



Melkweg, Амстэрдам



Korjaamo, Хельсінкі



Łaźnia Nowa, Кракаў

*Kaapelitehdas, Хельсінкі*

# 83 арэнда голых памяшканняў

*Калі пляцоўка з арэнднай прасторай для мерапрыемстваў дастаткова вялікая, яе можна пазіцыянаваць як незвычайнае па форме памяшканне, якое здаецца без дадатковых сэрвісаў. Не пасуе для адных імпрэз, але ж дасканалае для іншых.*

«Калі будынак пакінулі, памяшканне было нікому не патрэбнае – надта вялікае, надта вузкае, надта доўгае і ўсё такое. Але сёлета мы здаем яго агулам недзе на 170 дзён.

Усё, пачынаючы ад маленькіх кірмашоў, канцэртаў, мастацкіх выставаў, нават карпаратываў. Мы здаем яго як голае памяшканне, без усякага абсталявання, без прыладаў, без тэхнічнага персаналу. Можна прывезці сюды бар, свой персанал, усё сваё.

Напачатку ў нашай кампаніі не было ніякага абсталявання, мы мусілі здаваць яго як ёсць або не здаваць наагул. Да нашага здзіўлення, на памяшканне з’явіўся попыт.

Імпрэзы маюць сваю індывідуальнасць збольшага дзякуючы арганізатарам, якія ўвесь час мяняюцца. Тут можа ладзіцца Тыдзень хельсінкскага дызайну, потым рок-канцэрт, потым выстава свойскіх жывёлак. Вось пакажыце мне тэхнічны персанал, які зможа абслугоўваць такія розныя публікі? Але паколькі каардынатар імпрэзы кожны раз прывозіць сваю каманду і свой бар, адбываецца дасканалы падбор кадраў і няма адчування, што тут казённая зала для правядзення кангрэсаў».

*Стуба Нікула*





# 84 **праца за ежу**

*Адзіныя з персаналу, каму тут плацяць, – наглядчыкі і гукарэжысёр. Усе астатнія працуюць за ідэю. А таксама за вячэру, якая заўжды адбываецца перад імпрэзай у прысутнасці артыстаў.*

«Гэтая кухня – самае жывое месца ў "Інтэрзоне" – месца сустрэчы. Што робіць "Інтэрзону" такой адметнай для нас – дык гэта сумесная вячэра кожны вечар, калі ёсць канцэрт, на якую прыходзім мы (персанал), валанцёры і артысты. Зазвычай у нас ёсць кухар, які гатуе на ўсіх. Вельмі добры кухар. У нас раскошная вячэра, вельмі смачная. Мы шмат п'ем, і ў гэтым сэнсе мы пачынаем вечар як мае быць».

*Ада Ардуіні*

# 85 гільдыя цесляроў

*Цікавыя, дзёрзкія і досыць перадавыя праекты або магутныя сацыяльныя праекты могуць прывабіць добраахвотнікаў і адмыслоўцаў, якія будуць гатовыя працаваць задарма, дзеля грамадскай карысці.*

Цесляры з нямецкай гільдыі Axt und Kelle мусяць пакінуць дом на два гады дзеля падрыхтоўкі да ўступлення ў гільдыю. Збольшага яны працуюць на сацыяльных непрыбытковых праектах.



«Зрабілі яны шмат чаго. Першая іх выправа была ў 2000 годзе, але потым яны вярталіся яшчэ раз, калі мы пашыралі гаўбец. У першы год іх прыехала 30 чалавек, і нашыя людзі таксама шмат дапамагалі. Працавала шмат людзей.

Пазней, годзе, думаю, у 2005-м, быў другі аб’ект, і іх прыбыла толькі чалавек дзесяць.

Яны называлі гэта Sommertreffen, летнікам. Гэта звычайная практыка Axt und Kelle. На зімовых сходах яны вырашаюць, куды паехаць і якія аб’екты вартыя іх часу і высілкаў. Той зімой наш сябар адсюль паказаў на іхнім сходзе нашыя планы. Ім паступілі таксама іншыя прапановы, але яны вырашылі паехаць у “Мэтэлкову”».

*Наташа Сэрэц*


SESTRI



*NOASS, Рыга*

# 86 рамонт за кошт юбілею

«Нашыя сябры з будаўнічай фірмы святкавалі сваё 15-годдзе, а мы адзначалі ў той самы год 10-годдзе. Яны сказалі: добра, мы вам адрамантуем вашае судна з умовай, што вы дазволіце нам святкаваць на ім юбілей. Яны зрабілі рамонт за два тыдні. Мяне нават здзівіла, як хутка могуць працаваць людзі, калі ёсць жаданне і мэта. Праз тры тыдні ў іх быў прызначаны банкет, і таму яны ўкладіся ў тэрмін. А паколькі яны будаўнічая фірма, дык зрабілі ўсё як мае быць з датрыманнем усіх нормаў і з адпаведнай дакументацыяй».

*Дзынтарс Зілгалвіс*


SAMSUNG

# 87[1] дываны з выставачнага цэнтра

*Матэрыялы са спецыфічнымі тэхнічнымі характарыстыкамі, такімі як вогнетрываласць або гуканепратачальнасць, зазвычай нятанныя. Але ж іх можна здабыць там, дзе іх выкарыстоўваюць аднаразова.*

«Калі мы прыйшлі сюды, нам трэба было месца, якое пасуе для музыкі, бо гэта – нашая асноўная крыніца прыбытку. Столь была жахлівая, бо ўнутры яе рэзанаваў гук, лунала рэха. Трэба было вырашыць праблему. Мы ўсё рабілі самі, амаль з нулявым бюджэтам. Мы пайшлі папрасіць дывановае пакрыццё ў выставачна-кірмашовы комплекс.

Яны далі нам пакрыццё задарма, бо меліся яго выкінуць. Мы павесілі яго на столь. Акустыка моцна палепшылася – музыкі цяпер задаволеныя».

*Ада Ардуіні*

# 87²

«Мы не можам дазволіць сабе купляць шмат матэрыялаў, таму спрабуем шукаць такія, якія б нам пасавалі, але разам з тым мелі б усе неабходныя дазволы. Нам трэба адмысловыя вогнетрывалыя матэрыялы.

На вялікіх выставах-кірмашах выкарыстоўваюць шмат матэрыялаў, і паколькі яны прымаюць публіку, таму ім трэба выкарыстоўваць матэрыялы, якія адпавядаюць стандартам. Але пасля кірмашоў, калі экспазіцыю дэмантуюць, мы прыязджаем туды з вялікім грузавіком, чацвёра чалавек, і дамаўляемся ўзяць усе гэтыя матэрыялы, якія ўсё роўна выкідаюцца».

*Каміль дэ Віт*

*Menų spaustuvė, Вільня*

# 88 **дажджавікі задарма**

Некаторыя фірмы ў рэкламных і гандлёвых мэтах дораць пластыкавыя пакеты, асадкі, нататнікі або майкі. «Друкарня мастацтваў» падчас непагадзі выдае бясплатныя накідкі супраць дажджу. А дажджыць у Літве часта.





# 89 пазычанне

*Любая рэч, якую пазычылі на доўгі час, мае тэндэнцыю мяняць уладальніка.*

«Усё гэтае дарагое абсталяванне (бар і кухня) – грамадская ўласнасць. Мясцовыя ўлады хацелі зрабіць у адрэстаўраваным імі замку рэстарацыю. Яны давялі яе да ладу, абсталявалі, але цэлы год яна стаяла зачыненая. У гаспадароў памяняліся планы стасоўна замка.

Яны не ведалі, дзе захоўваць усе гэтыя рэчы. Мы займаліся рэнавацыяй і таму сказалі ім: добра, вы можаце пакінуць усё гэта нам. Мы перавезлі ўсё да сябе. Толькі зрабілі сякія-такія змены, каб у месца з'явіўся свой твар».

*Мікеле Бээ*

*Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна; Tabačka kulturfabrik, Кошыцэ; Lúč,Трэнчын; KC Dunaj, Браціслава*

# 90 шматразовыя кубкі

Чатыры незалежныя цэнтры культуры ў Славаччыне сталі выкарыстоўваць пластыкавыя кубачкі, якія можна мыць і выкарыстоўваць працяглы час.
Купляючы напой, спажывец плаціць адзін еўра закладу. Калі кубак аддаць бармэну, дэпазіт вяртаюць.
Замаўляючы кубкі разам, цэнтры ашчаджаюць грошы – чым больш замовіш, тым меншы сабекошт.



Bakelit MAC, Будапешт

# 91[1] прыбіральні

*Мусіць быць чыста. Калі ў традыцыйна брудным месцы пануе глянц-парадак, усё астатняе будзе браць з яго прыклад.*

«Культура сама па сабе прадукуе страты, мы ладзім вяселлі і карпаратывы, падчас якіх стан прыбіральняў вельмі важны».

*Мартан Баўэр*



# 91²

«Людзі любяць пакідаць надпісы на сценках. Для нас праблема захоўваць парадак у прыбіральнях, бо, як вядома, дзелавыя людзі любяць чысціню».

*Торстэн Райтлер*

*DOM La Cupola Del Pilastro, Балоння*

# 92 накіраванае святло

Зафарбаваўшы частку лямпачкі,
з кропкавай крыніцы святла
атрымалі накіраваны прамень.






RITRATTO DI
GIANNI BERENGO

# 93 лагатып

*Старыя аб'екты ў новым кантэксце набываюць новы сэнс.*

«Гэтае Z азначае "Задыяк" (назва нашага творчага калектыву), але таксама гэта N, якое азначае "Нокія-кабель". Літару знайшлі ў смецці…»

*Стуба Нікула*


N
Valssaamo

# 94 візітоўкі

У «Нот Кўайт» навясная палічка з візітоўкамі – азнака актыўнасці і розруху. Азнака месца, дзе людзі нешта робяць. Рамеснікі і мастакі прэзентуюць сябе лапікамі паперы. Некаторыя, уплішчыўшы на іх свае творы мастацтва, намагаюцца пераканаць у сваім таленце, іншыя адмовіліся ад гэтай задумы і проста падалі кантактныя звесткі.


GALLERI

*Not Quite, Фэнгерсфош*

# 95 культура плаката

Плакаты цэнтра «Нот Кўайт» адразу ж прыцягнулі маю ўвагу.




20-21 JULI
DAVID BATRA
Det här var ju tråkigt.
25/10
Medborgarhuset
Säffle Torsd 25/10
VINTERDANSEN
MEDBORGARHUSET - SÄFFLE
SPOTNICKS
LÖRDAG 1 DEC. 21-02
GRUS I
MASKINERIET
TILL SALU
ÖLTÄLT!
DECEMBER 2011

# 96 адкрытасць

*Усе дзверы незамкнутыя. Нават тыя, якія вядуць у маленькія пакойчыкі, якія ніхто не пільнуе. Гэта стварае атмасферу даверу і шчырасці.*

«Puta, perché! Я супраць усіх гэтых замыканняў, але niente! Яны ўвесь час хочуць замыкаць усё свеце.

У Антоніё тут кнігі. Тут яго катушок, дзе ён знаходзіцца ўвечары. Чакаючы, пакуль людзі сыдуць, ён бавіць час за вучобай. Але праблема ў тым, што маладыя людзі прыходзяць у яго пакой кахацца. Так што ёсць канфлікт».

*Мікеле Бээ*

*Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна*

# 97 вэрхал

*У цэнтрах культуры высокі ўзровень прадукавання «культурніцкага смецця».*

«На пачатку майстар-класаў Living Underground паветра брыняла патрэбай зрабіць нешта значнае.

Пазней шмат працы было зроблена, каб упарадкаваць сад. Былі ўсякія-розныя цяжкасці і праблемы. Трэба было правесці збор сродкаў, зладзіць абмеркаванне – шмат ціску з усіх бакоў, шмат працы. Пасля доўгага часу, прысвечанага справе, вы пачуваецеся не вельмі. Для некаторых справаў не ставала часу, штосьці пайшло не так, энергетычнай аддачы не адчувалася. Усё трэба было ўпарадкаваць.

Удзельнікі майстар-класа – людзі звонку. Яны прыйшлі ўлёгку, з розных асяроддзяў, і дзякуючы гэтаму яны могуць нам паказаць, дзе што паставіць. Яны стварылі першапачатковы парадак, які стуль і працуе. Яны прынеслі імпэт і свежае бачанне.

З аднаго боку, нічога не вырашана, з іншага – зроблена шмат.

Рэчы мусяць быць упарадкаваныя, бо толькі калі ўсё прыбрана, вы можаце нешта пачынаць рабіць».

*Марэк Адамаў*

# 98 **доступ**

*«Станцыя» знаходзіцца ля запруджанай шашы, якая адасабляе цэнтр ад прыгарадаў. Адзіны спосаб перасячы яе – падземны пераход, а там ад самага пачатку шмат доўгатрывалых праблем.*

**2005**

«Станцыя» сабрала 3 300 еўра і ўсе грошы пайшлі на рамонт падземнага перахода. У талацэ ўзялі ўдзел 25 чалавек – архітэктары, графічныя дызайнеры, мастакі, студэнты. Вынікі – асвятленне з ударатрывалых лямпаў (працуюць і сёння), белая фарба, каб асвятліць праход, і вылучаны колерам уваход.

**2012**

На выхадзе з падземнага перахода – новая крама фарбаў. Да свайго адкрыцця яны інвеставалі ў сваё асяроддзе і рэпутацыю – ахвяравалі белай фарбы, каб яшчэ раз паднавіць падземны пераход, які ўжо паспелі замаляваць графіцісты. Пафарбавалі пераход валанцёры. Ізноў парадак – да пары да часу.

**Будучыня**

Задума пабудаваць мост па-над шашой не прыжылася. Няварта ўкладаць сродкі і сілы ў тое, што сяк-так, але ж працуе, пакуль побач шмат важнейшых рэчаў, якія ўвогуле не працуюць або нават не існуюць у прыродзе.




industrial
DOLNÉ RUDINY
ZÁVODIE

*Suvilahti, Хельсінкі*

# 99 прыгажосць

*Калі рэч проста прыгожая, не давядзецца шукаць шмат довадаў у яе абарону.*

«Адно інтэрв'ю пра "Сувілахці" мела загаловак "Марыя Шарапава цэнтраў культуры".

Шарапава сапраўды прыгожая тэнісістка. Яна не найлепшая, але яна настолькі прыгожая, што пра яе напісана шмат артыкулаў. Шмат цэнтраў ТЕН такія прыгожыя, што нават у кепскага фатографа могуць атрымацца добрыя здымкі».

*Стуба Нікула*


KATTILAHALLI







*Łaźnia Nowa, Кракаў*

# 100 | уваход

*Паміж паркоўкай і ўваходам мне трэба трохі прайсціся. Нядоўгая, але прыемная праходка.*

Перад уваходам ходнік пашыраны. Утвараецца дыхтоўны падыход, які не толькі самавіта выглядае, але таксама рассцілаецца сімпатычнай пляцоўкай, якая ўжо з’яўляецца ўласнасцю тэатра «Новая лазня». Заходзіць усё больш людзей, мінаючы групкі курцоў, атмасфера спрэсоўваецца, мы заходзім праз шэраг бліскучых калон.





*Menų spaustuvė, Вільня*

# 101 ▌**велапаркоўка**

*Стаянка для ровараў, гардэроб для палітонаў. Базавыя выгоды для месца, у якое людзі прыйшлі па культуру.*

Галоўны ўваход у будынак – спалучэнне прыгажосці і простасці.




*menų spaustuvė

*Kaapelitehdas, Хельсінкі*

# 102 два фасады

У суботу апоўдні мы сядзім ля мора перад «Кабельным заводам» ужо сорак пяць хвілін. Некалькі чалавек за столікамі, што выцягнуў на вуліцу гаспадар. За ўвесь час – пяць мінакоў.





Мы ідзем да іншага бока будынка. Поўная супрацьлегласць прыспанай атмасферы з боку ўзбярэжнай. Людзі ўваходзяць і выходзяць з бліжэйшай станцыі метро. Падворак ля ўвахода доўгі, вузкі, з высокімі сценамі абапал. Тут знаходзяцца ўваходы да залаў, жыццё віруе.



# 103 галерэя на фасадзе

*Village Underground, Лондан*



Вокны на здымку – не вокны. Гэта рамкі выставы пад шклом, на фоне муроў таўшчынёй 1-4 м, уфармаваных падпорамі разбуранага віядука. Выставачная праграма, якой тут аддаюць перавагу, досыць спецыфічная. Але ўзяўшы пад увагу ўсё багацце выстаў, якія прапаноўвае культурнае жыццё Лондана, дык вельмі эфектыўна.



# 104 часовы фасад

Нясучыя стальныя канструкцыі падрыхтаваныя да таго, каб на іх навесілі шкляны фасад, які адпавядае ўсім крытэрам: ізаляваны, бяспечны, з добрай акустыкай. Не вытрыманы толькі адзін крытэр: прымальны кошт. Пакуль кошт не скінуць (што малаверагодна) або пакуль не знойдуцца грошы аплаціць пакупку, шкляны фасад замяняюць гумова-брызентавымі заслонамі.





*Röda Sten konsthall, Гётэборг*

# 105 ▌графіці

*Графіці з’яўляюцца, хочам мы таго ці не. Ёсць спосабы з імі змагацца, але, можа быць, калі па агульнай згодзе графіці пачнуць маляваць у нейкім адным месцы, праблема будзе вырашаная? Гэтае рашэнне патрабуе жадання абодвух бакоў, што не заўсёды спрацоўвае. Тут спрацавала.*

«Дом доўгі час называўся “Дом графіцістаў”. Сапраўды яскравы, ён шмат каму падабаўся, але ясна, шмат хто яго не любіў увогуле.

Пару гадоў назад мы графіці на дых не пераносілі. Але сёлета, шмат працуючы з маладзёнамі і праводзячы мастацкія варштаты для іх, мы вырашылі зрабіць першы легальны мур з графіці ў Гётэборгу. Мы назвалі яго “Цмокам”. 84 метры легальнай прасторы для малюнка.

Гэта знайшло ўдзячную аўдыторыю. Людзі малююць тут дні і ночы навылёт. Кампазіцыя мяняецца штодня. Чым лепей малюнак, тым даўжэй ён застаецца».

*Мія Крыстэрсдотэр Норман*




SAEZONE
BURNT OUT PUNKS

*Suvilahti, Хельсінкі*

# 106 ▌сувязь з супольнасцю графіцістаў

*Графіцісты – закрытая супольнасць, бо тое, што лічыцца самімі малявальнікамі з балончыкам (або мастакамі) аздобай, грамадствам прымаецца як вандалізм. Магчымасцяў наладзіць кантакт няшмат. Адна з іх – спецыялізаваная крама.*

Тэрыторыя ўключае адзін з нешматлікіх дазволеных муроў для графіцістаў у Хельсінкі. Побач крама “Фарбы”, якая таксама з’яўляецца галерэяй.

«Раней была праблема з графіці. “Сувілахці” была закрытай тэрыторыяй і раптам адчынілася. Людзі расфарбоўвалі муры будынкаў. Тады мы сказалі: тут будзе кут, дзе можна маляваць, не на мурах. Гэта працуе даволі спраўна, яны сапраўды паважаюць нас.

Сценкі з графіці – не праблема, праблема прыбраць за графіцістамі. Шторанак наша цывільная служба прыязджае забраць балончыкі і смецце. Цырк на дроце! Побач вялікі кантэйнер са смеццем, але прайсці пяць метраў – надта далёка.

Вельмі цяжка навязваць кантакт з людзьмі, якія гэтым займаюцца. Калі ёсць цяжкасці, дык лепей мець паміж імі і намі нейкае злучво. Такім злучвом з’яўляецца супрацоўнік крамы».

*Стуба Нікула*





# 107 дзірка

*Прабоіна – памятка, якая нагадвае пра колішнюю спробу зруйнаваць «Мэтэлкову», а таксама пра факт, што руйнаванне спыніла грамадскасць. Для людзей важна, каб прабоіна засталася менавіта такой формы.*

«Калі яны склалі кантракт, які трэба было падпісаць з мэрыяй, было вырашана яго не падпісваць, і гісторыя гэтага будынка атрымала зусім іншы вектар развіцця. У верасні 1993 года паміж дзявятай і дзясятай вечара некалькі чалавек пачулі, што набліжаюцца машыны, каб зруйнаваць будынкі. Людзі ўсталі і абаранілі будынкі».

*Ядранка Плут*





*Antic Teatre, Барселона*

# 108 ▌пергола

*Калі я хачу бачыць неба, гэта ўсяго толькі плоская і незаўважная канструкцыя. Калі мне трэба абарона ад сонца ці дажджу, я разгортваю паветку.*




SORTIDA

# 109 падворак

*Падворак "Антычнага тэатра" – мілы мікрасвет з прыязным норавам – за лічаныя метры ад запруджаных турыстамі вулак.*





# 110 сад на тэрасе

*У атачэнні цаглінаў, пакарабачанага жалеза, бетону і асфальту, якія прадстаўляюць усе адценні шэрага, каляровая гама дапаўняецца маленькім садочкам на тэрасе. Ад вясны да восені для наведнікаў будынка гэта галоўнае месца сустрэч.*





# 111 ▌тэраса з патэнцыялам

*Старыя будынкі звычайна хаваюць незасвоеную прастору, на першы погляд абсурдную: апендыкс, пустэча паміж двума функцыянальнымі крыламі.*

На першы погляд патэнцыялу тут няма. Але пасля добрых агледзін нескарыстанасць гэтай прасторы робіць яе месцам з патэнцыялам для сустрэч, курэння, ляжання, спання, імправізаванай тэатральнай сцэны, чытанняў, майстар-класа, вечарыны. Месцы, для якіх на плане кожнага паверха ніколі не могуць прыдумаць нармалёвую назву, але дзе ўсе сустракаюцца падчас абедзеннага перапынку.
Тэраса на даху асланяецца з трох бакоў самім будынкам і суседнім будынкам – з чацвёртага. Улетку тут цалкам магчыма зладзіць вячоркі і начное жыццё.
Першапраходзец у гэтай справе – папяльніца ля ўвахода.



# 112 ▌тэраса як рэклама

*Калі плаціць спонсар, няма патрэбы будаваць з танных матэрыялаў.*

Пабудову тэрасы на даху другога карабля А38 фундавала тэлефонная кампанія, чый імідж знітаваны з ружовым колерам – ажно няма патрэбы пісаць яе назву. Дастаткова кінуць позірк на крэслы і малюнак на падлозе – і кожны будзе ведаць, чый гэта падарунак.





*Kaapelitehdas, Хельсінкі*

# 113 гарод на даху

*Руплівы гароднік можа выгадаваць расліны нават на восьмым паверсе з падветранага боку.*

«Два гады таму ў наш офіс прыйшлі некалькі суседзяў і запыталіся, ці можам мы падрыхтаваць ім на даху месца для гарода. І вось што мы для іх зрабілі. Праўда, ёсць праблемы – нельга перагружаць дах і дзьме моцны вецер. Трэба выбіраць расліны, якія могуць выжыць у такіх умовах».

*Стуба Нікула*




KAAPELI

# 114 ▌зялёны дах

*Тэрмаізаляцыя, паглынанне ападкаў, месца адпачынку.*

Экскурсія па «УФА-фабрыцы» – гэта парад эксперыментальных будаўнічых рашэнняў, звязаных з навакольным асяроддзем.
«Калі ўлетку свеціць сонца, стандартны бітумны дах можа раскаліцца да 50°. Фольга пад верхнім слоем награецца да 25-35°. Таму памяшканні пад ёй прахалодныя і патрэбы ў кандыцыянаванні паветра няма.
У нас недзе 10 см глебы, якая захоўвае блізу 70 % дажджавых водаў. Раней у нас была праблема – вада выцякала з каналізацыйнай трубы, бо струмень не можа рухацца дастаткова хутка… Усе вуліцы былі затопленыя вадой, тут на "УФА-фабрыцы" таксама. Стуль як у нас ёсць зялёны дах, больш такога няма. Першы наплыў усмоктваецца зялёным дахам і потым вада ім выпараецца, а гэта таксама ахаладжае прастору тут у "Уфа". Яна забірае энергію з пакоя ніжэй, і гэта вельмі якасная сістэма кандыцыянавання паветра без дапамогі электрычнасці. Пыл з паветра адфільтроўваецца, у нашым будынку вельмі добры мікраклімат.
Нагрузка залежыць ад глебы. Напрыклад, калі вы возьмеце грунт, дык атрымаеце 16 кг/м2, калі ён насычаны вадой. Мы выкарыстоўваем палегчаную глебу з вагой 6,5 кг/м2, гэта менш чым палова.

Для зялёнага даху не патрэбная пляскатая паверхня. У нашага даху нахіл 25° і праблем няма. Калі вам трэба больш, скажам, 45°, тады будзе цяжка, такі дах трэба аснасціць барткамі бяспекі, а гэта дарага. 25° – максімум для зялёных дахаў.

У 1980-я ў Берліне існавала праграма, якая падтрымлівала пабудову зялёных дахаў, і большасць такіх дахаў былі пабудаваныя за грошы ўрада. Берлінскія гарадскія ўлады хочуць перахапіць увесь першы прыток вады ад зліваў, каб фекальныя воды не падымаліся і не выліваліся ў раку. Трэба будаваць вялізныя калектары, вялізныя сутарэнні з бетону, што ў два разы перавышае кошт пабудовы зялёных дахаў з тым самым эфектам».

*Вэрнэр Віяртаэля*



*OZU, Монтэлеонэ-Сабіна*

# 115 алейная культура

*Аліўкавы гай – інтэгральная частка цэнтра культуры. За горадам час цячэ павольней.*

«Нашая дзялка займае частку пагорка. Мы яе купілі. 350 дрэваў. Дрэвы трэба даглядаць кожны год. Кожны дзень. Гэта няцяжка; гэта вельмі проста. Проста праца. Каб атрымаць добры ўраджай аліваў, трэба абцінаць суччо, рыхтаваць глебу і гной. Не варта апырскваць насякомых. На гэтых вышынях – а тут 600 м узроўнем мора – насякомых, якія нішчаць алівы, няма. Тут усё экалагічна чыстае. У аліўкавых дрэваў няма ворагаў.

Існуе 2 000 розных відаў аліваў з рознымі ўласцівасцямі. Чырвоныя, чорныя, зялёныя. У нас зялёныя. Звычайна большыя не прыдатныя для алею, а маленькія – самае тое».

*Энрыка Блазі*

«У лістападзе, калі алівы саспелі, мы запрашаем людзей на суботу-нядзелю. Звычайна мы збіраем



алівы адзін ранак, у суботу. На другі сняданак разам робім барбекю. Потым удзень мы едзем да выціскальнай машыны. Сочым за ўсім працэсам і забіраем свежавыціснуты алей – можна нават прыгатаваць вячэру на свежым алеі. У нядзелю мы робім невялікую экскурсію па наваколлі і едзем да мясцовага возера, каб паглядзець старарымскія руіны. Потым ласуемся традыцыйнымі прысмакамі і каштуем розныя гатункі алею.

Прыехаць можа любы чалавек. Людзі плацяць за жытло, ежу і даезд. Найбольш цешацца сем'і з дзецьмі. Дзеці могуць гуляцца, качацца ў траве, караскацца або спускацца па схіле. Калі вы завядзеце гутарку з вяскоўцамі, яны скажуць: "О, сёння я сабраў сто кіло аліваў". 100 кг аліваў – гэта 20 л алею. Калі мы прыязджаем з людзьмі, дык разам збірае, можа, 10, 12, 15 чалавек. Увечары мы едзем да выціскальных машын з сотняй кілаграмаў аліваў. Зямля ўся ў стромых пагорках. Усё марудна».

*Паоля Сімоні*



# 116 асфальтаваная дзялка

*Асфальтабетоннае поле займае значную тэрыторыю комплексу. Улетку яно прымае фестывалі, для якіх трэба ставіць намёты. Каб палегчыць працу, на асфальце намаляваныя графічныя знакі, якія паказваюць, дзе і як глыбока можна замацаваць апоры.*

«Тут стаялі дрэвы, але глеба была вельмі забруджаная – азбест, крэазот, цыяніды. Адсюль выкапалі 57 000 тон забруджанай глебы і выкарчавалі ўсе дрэвы. Вось чаму ў нас тут усё заасфальтаванае.

Насамрэч гэтыя малюнкі – навігацыйная сістэма. Калі тут адбываецца фестываль, выкарыстоўваюць бетонныя вагі або пруты. Гэта навігацыйная сістэма, каб не пашкодзіць водаправод або кабелі. Белы азначае, што ўглыб можна максімум прабіцца на 50 см, шэры – 120 см, жоўты – 30 см. Чырвоны – нельга ўвогуле».

*Стуба Нікула*




MAX 20 CM

*Suvilahti, Хельсінкі*

# 117 адкрытая тэрыторыя

*Сукупнасць пабудоваў, якія першапачаткова складалі адзіны фабрычны комплекс, пасля трансфармацыі звычайна падзяляецца на меншыя ўстановы. Плот зносяць, прастора ўнутры можа стаць агульнадаступнай, злучыць належным чынам былы завод з гарадской структурай.*

«Адна з самых галоўных задач, якая стаіць перад намі ў дадатак да рамонту і напаўнення ўсіх памяшканняў, – адкрыць усю тэрыторыю для горада. Такія фабрычныя комплексы – закрытае месца. Іх прызначэнне – быць абгароджанымі, але цяпер яны зрабіліся часткай горада.

Якія платы прыбраць? Ці можам мы зрабіць новыя ўваходы? Навакольная тэрыторыя – пляцоўка, дзе адбываюцца мерапрыемствы. Але нават імпрэзы на вольным паветры патрабуюць пажарных выхадаў, таму вы не можаце рабіць іх на наглуха закрытым падворку фабрыкі.

Мы хочам развіваць цэлы раён Хельсінкі, а не толькі адно месца. Людзей, якія ходзяць сюды, не цікавіць, дзе сканчаецца наша тэрыторыя і пачынаецца гарадская. Яны проста карыстаюцца выгодамі горада».

*Стуба Нікула*




1 Voimalaitos / Kattilahalli
2&3 Kaasukellot
4 Makasiini
5 Tiivistämö
6 Puhdistamo
7 Konttori
8 Kojehuone
9 Mittarikorjaamo / Huilaamo
10 Porttirakennus
11 Valvomo
12 Yläpuutarha
13 Tapahtumakenttä
14 Graffitiaita
Olet tässä / You are here
Itäväylä
Sörnäisten rantatie
Kaasutehtaankatu

*Stanica Žilina-Záriečie, Жыліна*

# 118 бачнасць і бяспека

*Каб пачуцца ў бяспецы, трэба паруціцца пра ваколіцы. Бачыць, што адбываецца навокал, і зрабіцца бачнымі для іншых.*

Парк вакол «Станцыі» ствараў праблемы. Цяпер ёсць агароджа, але яна ўсё роўна не ратуе ад вандалаў. Пасля заходу сонца, калі робіцца сапраўды цёмна, людзі п’юць пад дрэвамі, запаганьваюць пабудовы і пакідаюць горы смецця. Ліхтары, якія звісаюць з недасяжнай вышыні, дазваляюць да пэўнай ступені кантраляваць грамадскі парадак.





*Röda Sten konsthall, Гётэборг*

# 119 развіццё тэрыторыі

*Любая мясцовая ўлада мае інструмент гарадскога развіцця, які выкарыстоўвае, каб стварыць план для будучага функцыянавання горада. Калі план не ў дастатковай ступені апісвае тэрыторыю вакол цэнтра або з нашага гледзішча размяркоўвае ўсё памылкова, можна сфармуляваць контрпрыклад. Важна абазначыць патрэбнае нам месца звонку, паказаць, што мы ведаем яго і можам уладкаваць яго найлепшым чынам.*

«Горад не вельмі звязаны з вадой. Каб гэта змяніць, вядзецца інтэнсіўны працэс планавання – пабудаваць набярэжную ад “Чырвонага каменя” праз увесь Гётэборг па гэтым баку. Гарадскі план вырашыў спыніцца вунь там, ля найбліжэйшага моста. Наш цэнтр культуры па-за межамі гэтага плана. Гэта вельмі кепска, бо яны мусілі працаваць са старым планам.
На мінулым тыдні, напрыклад, здарылася напраўду дзіўная падзея. У Гётэборг заходзяць раскошныя круізныя лайнеры – сапраўды вялікія. Яны не могуць зайсці ў горад, бо мост надта нізкі. Таму цяпер яны шукаюць пункт, дзе прышвартавацца. Прагучала прапанова паставіць іх тут, і калі б у нас быў план, такога ніколі не здарылася б – у іх няма шанцаў атрымаць дазвол. Але цяпер існуе рызыка, што яны паставяць караблі тут. Таму я б хацела, каб план быў у нашых руках для слушных мэтаў».
Цэнтр культуры «Чырвоны камень» запрасіў кампанію з неабмежаванай адказнасцю STEALTH, якая ініцыявала праект «тэставання водаў» (Dis)assemble («Разборка»).
Гэты праект развіваў, а таксама высвятляў – у вельмі практычнай манеры – варыянты развіцця, а таксама тон, як бачаць ваколіцы цэнтра людзі, якія прыходзяць сюды і карыстаюцца выгодамі гэтай тэрыторыі.

«Мы не хочам, каб вакол нас нешта будавалі. Мы хочам нешта рабіць самастойна. Мы не хочам офісаў і безгустоўных кватэр. Мы хочам кантраляваць тэрыторыю, выкарыстоўваць яе, як мы рабілі гэта цягам 20 гадоў. Мы хочам, каб тут ладзіліся фестывалі, што заўгодна, што падабаецца людзям. У гэтым сэнсе праект STEALTH быў і поспехам, і паразай адначасова. Прыйшлі людзі і канструявалі ўсякія-розныя макеты. Гэта было як вялізная пляцоўка для гульняў і гэта было сапраўды выдатна – па-мастацку, адукацыйна. Але гэта не азначае, што мы хочам тут будынкі. Мы хочам, каб людзі сюды прыходзілі і рабілі што ім заманецца».

*Мія Крыстэрсдотэр Норман*




SAEZONE

# 120[1] агароджы

*Пабудова агароджы – просты і хуткі спосаб*
*пазначыць тэрыторыю, упарадкаваць плынь*



*Fabryka Sztuki, Лодзь*

# $120^2$

*Калі ёсць часовыя праблемы, неабходна адказаць на іх часовымі рашэннямі.*





# 121 вольнае поле

*Прастора «Мануфактуры Кнос» сама па сабе не дастаткова незвычайная, каб выклікаць незвычайнасць у жыцці ўнутры сябе. Яна дастаткова вялікая і адкрытая, астатняе – пытанне самадысцыпліны.*

«Гэтая тэрыторыя на сёння даступная цягам пяці або шасці месяцаў. Мы працуем над праектам па стварэнні парку і саду з вольным уваходам. “Кнос” – вольная прастора ваганняў. Гэта азначае, што няма напрамку, няма каардынацыі, няма групы, якая ёй загадвае. Гэта месца, дзе ўсе могуць рабіць усё, што ён або яна лічаць належным, і дзе людзі могуць аб’ядноўвацца з іншымі. У нас толькі адно правіла: хто прапанаваў, той сам і робіць. Гэтага дастаткова. Гэтае месца сапраўды адкрытае для спантаннасці, вынаходстваў. Тут мы ўсе хочам рабіць падобныя рэчы».

*Мікеле Бээ*





*Metelkova, Любляна*

# 122 мастацтва супраць крэатыву

*Афіцыйная культура супраць незалежнай (з незалежнага гледзішча).*

Увесь гэты гарадскі квартал спярша належаў войску. Калі войска сышло, горад падзяліўся на дзве паловы. Адна палова ўтрымліваецца дзяржавай. Міністэрства культуры інвестуе ў афіцыйна прынятую культуру, будуе новыя дамы і стварае новыя ўстановы. Другая палова ўтрымліваецца мясцовай уладай. Тут можна знайсці меншыя арганізацыі і групы мастакоў, самарэгуляваную незалежную культуру. Мяжа між імі пазначана вузкім праходам. Гэта дэмаркацыйная паласа, якая пазначае знаходжанне мастацтва і крэатыву.





# 123 канец

*Цэнтр бачыў лепшыя дні. Фабрыка культуры «Палімер» больш не сябра ТЕН, рытм дзейнасці запаволіўся, ва ўсіх свае праекты. Я адчуваю, што ўсяму хутка прыйдзе канец.*

«Няма будучыні. Думаю, што з гэтым домам скончана. Можа быць, у будучыні гэта можа працягвацца з іншымі людзьмі ў іншым месцы. Задумы заўсёды ёсць.

Уладальнік тут ні пра што не дбае. Не ведаю, чаму ён захоўвае ўсё ў такім стане. Я думаю, ён вычэквае стасоўны момант, каб усё дэмантаваць і зрабіць замест цэнтра нешта іншае.

Я не веру, што магчыма знайсці спосаб аднавіць тут усё і зрабіць прыгожым. І я не ўпэўнены, ці я засмучаюся з гэтай нагоды. Можа, гэта нават да лепшага. Шчаслівы квіток.

Трохмесячны кантракт з уладальнікам пэўным чынам развязвае рукі, неяк вызваляе – ты ведаеш, што ты робіш, ты не захрас, цябе нічога не трымае. Можа быць, гэта не такая ўжо вялікая драма, калі ўсё навокал руйнуецца і недзе ў іншым месцы будзе нешта новае».

*Танэл Саар*





# 124 цітры

Выданне 2014 года
Першы наклад 700 ас.

Выдавец
| Truc sphérique,
Цэнтр культуры
Stanica Žilina-Záriečie,
www.stanica.sk

Друк і пераплёт
i + i print spol s.r.o.

Рэдактар, аўтар тэкстаў
Peter Lényi | Пэтэр Лені

Афармленне
Marcel Benčík | Марцэл Бэнчык
Peter Liška | Пэтэр Лішка

Більд-рэдактар
Peter Snadík | Пэтэр Снадзік

Су-рэдактары
Marek Adamov | Марэк Адамаў
Róbert Blaško | Робэрт Блашка
Pavla Lényiová | Паўла Леніява
Peter Hapčo | Пэтэр Гапча

Пераклад, вычытка
Monika Šusteková | Моніка Шусцекава
Sandy Fitzgerald | Сэндзі Фіцджэралд
Christopher Ketchum | Крыстафэр Кетчум
Elena Aya Bountouraki | Элена Ая Бунтуракі

Супраца
Katarína Gatialová | Катарына Гацьялава
Marek Harčarík | Марэк Гарчарык
Matej Veverka | Мацей Вэвэрка
Estelle Weiss-Tisman | Эстэл Вайс-Тысман
Marta Blašková Maňáková | Марта Блашкава Манякава
Jana Baierová | Яна Баерава

Інфарманты
Ada Arduini | Ада Ардуіні
Agata Etmanowicz | Агата Этмановіч
Agnė Tuskevičiūtė | Агне Тускявічуце
Amelie Snyers |Амэлі Снаерз
Andrea Alba | Андрэа Альба
Benedek Vasak | Бэнэдэк Васак
Borut Wenzel | Борут Вэнцэль
Camille de Wit | Каміль дэ Віт
Cor Schlosser | Кор Шлёсэр
Dzintars Zilgalvis | Дзынтарс Зілгалвіс
Enrico Blasi | Энрыка Блазі
Federica Rocchi | Фэдэрыка Рокі
Jadranka Plut| Ядранка Плут
Juri Battaglini | Юры Баталліні
Karl Hallberg | Карл Гальбэрг
Kate Zilgalve | Катэ Зілгалвэ
Lemmit Kaplinski | Леміт Каплінскі
Marek Adamov| Марэк Адамаў
Márton Bauer | Мартан Баўэр
Maurizio Buttazzo | Маўрыц'ё Бутаца
Mia Christersdotter Norman | Мія Крыстэрсдотэр Норман
Michele Bee | Мікеле Бэз
Monika Chabanová | Моніка Хабанава
Nataša Serec | Наташа Сэрэц
Olli Hietajärvi |Олі Хіетаярві
Paola Simoni | Паоля Сімоні
Paul Bogen| Пол Боўген
Róbert Blaško | Робэрт Блашка
Sandra Jõgeva | Сандра Йыгева
Sandra Ottoson | Сандра Отасан
Sandy Fitzgerald | Сэндзі Фіцджэралд
Semolinika Tomic | Сэмалініка Томіч
Sigrid Niemer | Зігрыд Німэр
Stuba Nikula | Стуба Нікула
Tanel Saar | Танэл Саар
Torsten Reitler | Торстэн Райтлер
Werner Wiartalla | Вэрнэр Віярталя
Ася Филиппова | Ася Філіпава

Удзельнікі / вядоўцы майстар-класаў Living Underground, 2012 год
Adam Gebrian | Адам Гебрыян
Alison Killing | Элісан Кілінг
Cor Schlosser| Кор Шлёсэр
Juri Battaglini | Юры Баталліні
Katarína Gatialová | Катарына Гацьялава
Karl Hallberg | Карл Гальбэрг
Lea Linin | Леа Лінін
Ľubica Segečová | Любіца Сэгечава
Marcel Benčík | Марцэл Бэнчык
Martin Jančok | Марцін Янчак
Maurizio Buttazzo | Маўрыц'ё Бутаца
Michele Bee | Мікеле Бэз
Nina Vurdelja | Ніна Вурдэля
Peter Lényi | Пэтэр Лені
Peter Liška | ПэтэрЛішка
Semolinika Tomic | Сэмалініка Томіч
Stuba Nikula | Стуба Нікула
Zuzana Godálová | Зузана Годалава
Наталля Новік
Яраслаў Таранаў

Фота, рысункі
(з нумарамі раздзелаў)
| Peter Lényi: 6e, 9, 13, 14, 15, 18, 22, 25, 30b, 30g, 30h, 37, 51a, 42, 43, 44, 46, 52, 54, 58b, 61, 63, 65, 72, 74, 75, 76, 77, 78, 79, 82a-b, 82e-h, 85, 91, 92, 94, 95, 103, 105, 107, 108, 109, 115, 120a, 121, 122
| Peter Snadík: 5, 6a, 6d, 7, 20, 27, 30c, 30e, 30f, 30j, 35, 45, 47, 48, 51, 53, 55, 56, 57, 59, 60, 62, 64, 67, 70b-e, 71b, 73, 82c, 82i, 82k, 83, 86, 88, 93, 99, 100, 101, 102, 104, 106, 110, 111, 113, 116, 117, 120b, 123
| Lucia Blanáriková: 16, 29, 31, 36, 38, 39b, 43b, 58a, 70a, 71a
| Stanica archive: 21, 23, 30d, 33, 34, 69, 90, 98, 118
| Melkweg archive: 6c, 24, 30a, 30i, 82d, 82j
| A38 archive: 6b, 17, 112
| Google Earth: 4, 19
| Antic Teatre archive: 32, 39a
| ThisWayDesign: 3
| Zuzana Godálová: 24
| Attila Urban: 40
| ufaFabrik archive: 114
| STEALTH.unlimited archive: 119

Даты запісу

2005/05
| Buenaventura, Castelfranco Veneto

2012/05
| A38, Budapest
| Bakelit MAC, Budapest
| Tabačka Kulturfabrik, Košice

2012/08
| Stanica Žilina-Záriečie
| Melkweg, Amsterdam
| Antic Teatre, Barcelona

2012/09
| ufaFabrik, Berlin
| Not Quite, Fengersfors
| Röda Sten konsthall, Göteborg
| Moritzbastei, Leipzig
| Centre for Creative Industries Fabrika, Moscow

2012/12
| WUK, Wien

2013/02
| Mains d'Oeuvres, Paris

2013/05
| Pekarna magdalenske mreže, Maribor
| Metelkova, Ljubljana
| Interzona, Verona
| OZU, Monteleone Sabino
| Manifatture Knos, Lecce
| DOM, Bologna

2013/07
| Teatr Łaźnia Nowa, Kraków
| NOASS, Riga
| Menų spaustuvė, Vilnius
| Kultuuritehas Polymer, Tallinn
| Suvilahti, Helsinki
| Kaapelitehdas, Helsinki
| Korjaamo, Helsinki
| Verkatehdas, Hämeenlinna
| Creative Centre Carnation, Tartu
| Fabryka Sztuki, Łódź

2013/12
| Village Underground, London
| Nová synagóga, Žilina

# 125 ▌удзельнікі

| A38, Вугоршчына, Будапешт, www.a38.hu
| Antic Teatre, Іспанія, Барселона, www.anticteatre.com
| Bakelit Multi Ars Centre, Вугоршчына, Будапешт, www.bmac.hu
| DOM La Cupola Del Pilastro, Італія, Балоння, www.domlacupoladelpilastro.it
| Fabryka Sztuki, Польшча, Лодзь, www.fabrykasztuki.org
| Interzona, Італія, Верона, www.izona.it
| Kaapelitehdas, Фінляндыя, Хельсінкі, www.kaapelitehdas.fi
| Korjaamo, Фінляндыя, Хельсінкі, www.korjaamo.fi
| Mains D'Oeuvres, Францыя, Бардо, www.mainsdoeuvres.org
| Manifatture Knos, Італія, Лечэ, www.manifattureknos.org
| Melkweg, Нідэрланды, Амстэрдам, www.melkweg.nl
| Menų spaustuvė, Літва, Вільня, www.menuspaustuve.lt
| Metelkova, Славенія, Любляна, www.metelkovamesto.org
| Moritzbastei, Нямеччына, Ляйпцыг, www.moritzbastei.de
| NELK, Эстонія, Тарту, www.nelk.ee
| NOASS, Латвія, Рыга, www.noass.lv
| Not Quite, Швецыя, Фэнгерсфош, www.notquite.se
| Nová synagóga, Славакія, Жыліна, www.novasynagoga.sk
| Oficina di Buenaventura, Італія, Кастэльфранка Венета, www.buenaventura.it
| OZU, Італія, Монтэлеонэ-Сабіна, www.ozu.it
| Pekarna magdalenske mreže, Славенія, Марыбор, www.pekarna.org
| Polymer, Эстонія, Талін, www.kultuuritehas.ee
| Röda Sten konsthall, Швецыя, Гётэборг, www.rodasten.com
| Stanica / Truc sphérique, Славакія, Жыліна, www.stanica.sk
| Suvilahti, Фінляндыя, Хельсінкі, www.suvilahti.fi
| Tabačka kulturfabrik, Славакія, Кошыцэ, www.tabacka.sk
| Łaźnia Nowa, Польшча, Кракаў, www.laznianowa.pl
| ufaFabrik, Нямеччына, Берлін, www.ufafabrik.de
| Verkatehdas, Фінляндыя, Хямээнлінна, www.verkatehdas.fi
| Village Underground, Вялікая Брытанія, Лондан, www.villageunderground.co.uk
| WUK, Аўстрыя, Вена, www.wuk.at
| Цэнтр творчых індустрый «Фабрика», Расія, Масква, www.proektfabrika.ru

WITH FINANCIAL SUPPORT
OF THE MINISTRY OF CULTURE
OF THE SLOVAK REPUBLIC

Engine Room Europe

Culture Programme

Engine Room Europe (анг. «Машыннае аддзяленне Еўропы») была трохгадовай праграмай (з красавіка 2011 года да траўня 2014 года), з мерапрыемствамі, прысвечанымі незалежным працаўнікам культуры ды іх творчым працэсам. Праграму заініцыявала аб'яднанне Trans Europe Halls (TEH), і каардынавалася яна цэнтрам культуры Melkweg (Амстэрдам, Нідэрланды) у асацыяцыі з 10 заснавальнікамі сеткі TEH. Engine Room Europe ажыццявілася дзякуючы падтрымцы Еўрапейскай Камісіі. Гэтая камунікацыя адлюстроўвае толькі меркаванні аўтараў, і Камісія не нясе адказнасці за любое выкарыстанне інфармацыі, якую змяшчае гэтае выданне.

Мы зрабілі гэта, бо зрабілі гэта добра.